WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 СТУДЗЕНЯ 2010 г. СЕРАДА № 9 (26617)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Прамая лінія

## НЕТРАДЫЦЫЙНАЯ МЕДЫЦЫНА СУПРАЦЬ ТРАДЫЦЫЙНЫХ ХВАРОБАЎ

Госцем нашай чарговай «прамой лініі» будзе **прафесар, доктар медыцынскіх навук, загадчык кафедры рэфлексатэрапіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, галоўны спецыяліст па нетрадыцыйных метадах лячэння Міністэрства аховы здароўя Беларусі Аляксандр СІВАКОЎ.**

Аляксандр Паўлавіч вывучае ўсходнюю медыцыну больш за 30 гадоў. Чатыры разы ён стажыраваўся ў Кітаі, а ў 1991 годзе — у Інстытуце традыцыйнай в'етнамскай медыцыны. Аб тым, якія сучасныя тэхналогіі нетрадыцыйных метадаў лячэння існуюць і пры якіх захворваннях дапамагаюць, вы можаце спытаць у нашага госця.

***«Прамая лінія» адбудзецца 26 студзеня, у аўторак, з 12.00 да 13.00 па нумарах 8(017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).***

# УЛАДКАВАННЕ КОМПЛЕКСУ «СТУДЭНЦКАЯ ВЁСКА» Ў МІНСКУ ПАВІННА БЫЦЬ ЗАВЕРШАНА ДА КАНЦА 2013 ГОДА



Фота БЕЛТА.

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў час наведвання комплексу «Студэнцкая вёска» ў Мінску.**

Плануецца, што ўвод у эксплуатацыю васьмі інтэрнатаў Студэнцкай вёскі завершыцца ў канцы 2011—пачатку 2012 гадоў. У другім квартале гэтага года кампанія «Трайпл» пачне будаўніцтва спартыўнага аб'екта коштам Br120—130 млрд. Акрамя таго, на тэрыторыі комплексу будуць пабудаваны буйная аўтамабільная паркоўка і гандлёва-забаўляльны цэнтр.

Звяртаючыся да студэнтаў, кіраўнік дзяржавы пажадаў ім не губляць каштоўнага часу. «Цяпер тэмп жыцця такі, што калі сёння штосьці ўпусціш, то заўтра ўжо не навярстаеш. Таму раю вам па максімуму атрымаць карысць ад навучання ў ВНУ», — сказаў ён.

Адказваючы на пытанне аб тым, чым запомніліся яму студэнцкія гады і пражыванне ў інтэрнаце, Аляксандр Лукашэнка расказаў: «Я добра памятаю свой першы інтэрнат — гэта быў інтэрнат бібліятэчнага тэхнікума. Бібліятэкараў мы жартам называлі «прамакаткамі». Са мной вучыліся цяперашні міністр адукацыі Радзькоў (ён быў вельмі таленавітым студэнтам, вучыўся на фізмаце), у інтэрнаце мы жылі разам з маім цяперашнім памочнікам Мацвейчуком. Я памятаю ўсе дэталі, «напрыклад, як мы захоўвалі сала, запіхваючы яго паміж аконнымі форткамі, абед у студэнцкай сталовай за 42 капейкі і шмат, шмат спорту».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што аднакурснікі жартавалі: «Мы кудысьці ездзім, гуляем... а Лукашэнка, згорбіўшыся, ідзе некуды з кучай кніг».

Прэзідэнт адзначыў, што «сёння ў нас некаторыя рэктары і выкладчыкі вырашылі, што студэнтаў наогул не трэба выпускаць з аўдыторыі: праводзяць з імі бясконцыя трэнінгі і гэтак далей. Гэта не зусім правільна — студэнт павінен навучыцца працаваць самастойна, больш сядзець у бібліятэцы, працуючы з першакрыніцамі».

Пры гэтым кіраўнік дзяржавы даў даручэнне ў будучыні пры будаўніцтве студэнцкіх гарадкоў і вёсак улічваць, наколькі блізка яны будуюцца да вучэбных карпусоў. «Трэба ўлічваць фактар перамяшчэння студэнтаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Гэта не справа, калі навучэнцы будуць з Уручча ездзіць на другі канец горада і наадварот. Атрымліваецца, што яны будуць штурхацца ў грамадскім транспарце па некалькі гадзін у дзень. Да таго ж гэта вялікая нагрузка на гарадскі транспарт».

У свеце ўжо адыходзяць ад практыкі пасялення студэнтаў розных ВНУ ў адным месцы. «У будучыні гэта трэба ўлічваць, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Магчыма, пры засяленні ў інтэрнаты прыярытэт трэба аддаць студэнтам блізкіх ВНУ (медуніверсітэта, напрыклад), студэнтам-іншаземцам».

Беларусь зацікаўлена ў большым прыцягненні замежных студэнтаў у ВНУ.

«Мы будзем будаваць больш інтэрнатаў для студэнтаў, у тым ліку для замежных, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Замежныя студэнты, якія атрымалі адукацыю ў нас, — гэта нашы людзі за мяжой». Пры гэтым Прэзідэнт дадаў: «Гэта вялікая справа, калі чалавек едзе ад нас, атрымаўшы адукацыю, а мы з ім можам падтрымліваць кантакты, якія могуць быць нам карысныя».

Наведваючы інтэрнат № 11 Студэнцкай вёскі, Аляксандр Лукашэнка пагутарыў з туркменскімі і кітайскімі студэнтамі, якія навучаюцца ў БДУ. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што Беларусь выйграе ў плане спакойнага і дружалюбнага стаўлення да замежных студэнтаў, калі параўноўваць яе з Расіяй або Украінай. «У нас вельмі добра ставяцца да кітайцаў. Мы сябруем з вашай краінай ужо вельмі даўно, каля 20 гадоў, — сказаў Прэзідэнт. — Кітай становіцца вядучай сусветнай дзяржавай, і мы ў гэтым зацікаўлены». Звяртаючыся да студэнтаў-іншаземцаў, кіраўнік дзяржавы запэўніў: «Мы вас лічым сваімі і будзем на вас разлічваць».

«Гэты няшчасны крызіс скончыцца, і мы будзем больш актыўна рэалізоўваць праект па будаўніцтве «Мінск-Сіці», — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Гэта добры праект, і мы ад яго не адмаўляемся».

Выконваючы абавязкі старшыні Мінскага гарвыканкама Мікалай Ладуцька праінфармаваў кіраўніка дзяржавы аб тым, што ў верасні 2012 года будзе завершана будаўніцтва трох станцый маскоўскай лініі метрапалітэна (па напрамку ўздоўж праспекта Дзяржынскага), а ў верасні 2013 года будзе закончана будаўніцтва станцыі «Малінаўка».

Адказваючы на пытанне студэнта аб ходзе будаўніцтва новага корпуса факультэта міжнародных адносінаў БДУ на Прывакзальнай плошчы, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што бюджэт 2010 года прадугледжвае выдзяленне на будаўніцтва корпуса дадаткова Br1 млрд.

Размаўляючы са студэнтамі ФМА, Прэзідэнт нагадаў, што ў свой час падтрымаў рашэнне аб тым, каб кваліфікаваных дыпламатаў у Беларусі рыхтавала адна ВНУ. «Лепш развіваць адзін цэнтр падрыхтоўкі дыпламатаў», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, дадаўшы, што вопыт прыватных ВНУ ў гэтым плане сябе не апраўдаў.

«Мы вельмі акуратна паставіліся да прыватызацыі ВНУ, практычна нічога ў гэтай сферы не прыватызавалі. І, як паказала практыка, гэта рашэнне было правільным. Нам не патрэбны ВНУ-шарлатаны, якія не даюць нармальных ведаў», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

На факультэце міжнародных адносінаў БДУ цяпер навучаюцца каля 3 тыс. 300 чалавек.

«Таленавітыя людзі — гэта сэрца нацыі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — І калі мы іх у свой час знайшлі, падтрымалі, то яны не павінны ў далейшым згубіцца, растварыцца ў натоўпе. Менавіта таму мы і стварылі банк даных таленавітай моладзі, каб таленавітыя людзі не зніклі з поля зроку».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што галоўнай мэтай спецыяльнага прэзідэнцкага фонду падтрымкі таленавітай моладзі з'яўляецца дапамога таленавітым людзям, якія не могуць сябе ў поўнай меры забяспечыць матэрыяльна. «Галоўная задача фонду — падтрымаць тых, каму не хапае гэтай няшчаснай капейкі. Каб была нейкая стартавая пляцоўка. Не страціць таленавітага чалавека — вось галоўны прынцып», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы прыгадаў выпадак, калі яго пазнаёмілі з творчасцю юнай Насці Віннік. «Я тады зараз жа папрасіў, каб яе падтрымалі, — сказаў Прэзідэнт. — Як бачыце, у нас у краіне не праблема давесці інфармацыю аб таленавітым чалавеку нават да ўзроўню кіраўніка дзяржавы, каб атрымаць адпаведную падтрымку. Бо для Беларусі гэта вельмі важна — гэта імідж краіны».

«Я прыхільнік шчырай палітыкі, — сказаў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы на адно з пытанняў студэнтаў. — Ад сваёй сумленнасці я пакутую 15 гадоў». Прынята лічыць, адзначыў Прэзідэнт, што палітыкі звычайна думаюць адно, а гавораць іншае і сумленнасць — не самая зручная для палітыка якасць. «Я ў гэтым плане спрабую перавярнуць свет. Я лічу, што ў палітыцы лепш быць сумленным, бо калі сёння ты кажаш адно, а заўтра робіш іншае, то цябе могуць абвінаваціць у хлусні», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

**Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.**

## ЛЕПЕЛЬСКАЯ РУСАЛАЧКА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Міфалагічны вобраз Русалкі, адліты ў метале, з'явіўся мінулым летам на маляўнічым беразе Лепельскага возера. Жыхары горада і ў зімовы час наведваюць гэты русалчын куток.**

## ЭПІДСІТУАЦЫЯ СТАБІЛЬНАЯ, АЛЕ ТРЫВОЖНАЯ

**Як паведамляе прэс-служба Міністэрства аховы здароўя, за апошні тыдзень з 11 па 17 студзеня захваральнасць беларусаў на прастудныя захворванні і грып пачала расці.**

Так, у параўнанні з папярэднім тыднем, калі з-за святаў і школьных канікулаў мала хто з беларусаў лічыў патрэбным звяртацца за дапамогай ва ўстановы аховы здароўя, колькасць зваротаў да медыкаў павялічылася ў 1,4 раза. У беларускай сталіцы за тыдзень захварэлі 19,5 тысячы чалавек, большую палову захварэ»ых складаюць дзеці і падлеткі ва ўзросце да 17 гадоў. Аднак цяпер паказчыкі захваральнасці на ВРВІ ні ў сталіцы, ні па краіне не перавышаюць эпідэмічны парог.

Спецыялісты прагназуюць, што абвастрэнне эпідэмічнай сітуацыі можа распачацца ўжо напрыканцы студзеня. Падчас усіх папярэдніх эпідэмій грыпу «гаручым матэрыялам» для эпідэмій станавілася дзятва — дзеці і падлеткі складалі большую палову сярод агульнай колькасці ахвяр прастудных захворванняў. І толькі апошні эпідэмічны пад'ём, які назіраўся ў Беларусі ў лістападзе, ахапіў пераважна дарослае насельніцтва краіны, а школьнікі ў той час былі «ізаляваныя» на дадатковых школьных канікулах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Тваё правы

# ХТО МЕРЗНЕ, ТОЙ ПРАЦУЕ МЕНШ

Сяргей ГРЫБ

**Кожны работнік мае права на здаровыя і бяспечныя ўмовы працы — так вызначае наша заканадаўства. Прычым у тым ліку гаворка ідзе аб нармальным тэмпературным рэжыме. Так, шматлікія даследаванні сведчаць, што пасля таго, як слупок тэрмометра ў вытворчым памяшканні ўзнімаецца вышэй за адзнаку 26 градусаў цяпла, працаздольнасць змяншаецца на 10 працэнтаў. А тэмпература, ніжэйшая за 18 градусаў, для прадстаўнікоў большасці прафесій — гэта прамы шлях да «бальнічных».**

### СЯДЗЕЦЬ ЦІ НАСІЦЬ — РЭЧЫ РОЗНЫЯ

Тым часам існуюць дакладныя патрабаванні да мікраклімату на працоўных месцах. Санітарныя правілы і нормы вызначаюць, што для абароны ад пераахаладжэння ці перагрэву персаналу тэмпература паветра ў вытворчых памяшканнях не можа быць ніжэйшай або вышэйшай за пэўныя паказчыкі.

У прыватнасці, для людзей, якія працуюць седзячы і не прыкладаюць значных фізічных намаганняў (шэраг прафесій дакладнага прыбора- і машынабудавання, на гадзіннікавай або швейнай вытворчасці, у сферы кіравання ці ў офісах), дапушчальная тэмпература ў халодны (з сярэднясутачнай тэмпературай вонкавага паветра менш за 10 градусаў па Цэльсію) час года не можа быць ніжэйшай за 20, а ў «летні» перыяд года — вышэйшай за 28 градусаў цяпла.

Для работ, якія выконваюцца седзячы ці стоячы і звязаныя з хадой і пэўным фізічным напружаннем (кантралёры, майстры ў розных відах вытворчасці, супрацоўнікі прадпрыемстваў сувязі, прадстаўнікі шэрагу прафесій паліграфічнай прамысловасці), гэтыя паказчыкі складаюць адпаведна — 19 і 28 градусаў; для работ, звязаных з пастаяннай хадой, перамяшчэннем прадметаў вагой да 1 кілаграма або прадметаў са становішча седзячы ці стоячы, і патрабуюць фізічнага напружання (шэраг прафесій у механазборачных цэхах машынабудаўнічых прадпрыемстваў, у прадзільна-ткацкай вытворчасці і г.д.) — 17 і 27; пры работах, якія звязаныя з хадой, пераносам ці перамяшчэннем прадметаў вагой да 10 кілаграмаў і суправаджаюцца ўмераным фізічным напружаннем (шэраг прафесій ў ліцейных, кавальскіх, тэрмічных, зварачных цэхах машынабудаўнічых і металургічных прадпрыемстваў і г.д.) — 15 і 27.

Нарэшце, пры работах, звязаных з пастаянным перасоўваннем, перамяшчэннем ці пераноскай прадметаў вагой больш за 10 кілаграмаў і патрабуюць вялікіх фізічных намаганняў (ручное каванне, ручная набіўка і заліўка ў ліцейных цэхах і г.д.) гранічны паказчык тэмпературы ў халодны перыяд года не можа быць ніжэйшым за 13, а ў летні перыяд — вышэйшым за 26 градусаў па Цэльсію.

Пры гэтым адначасова існуюць нарматывы па вільготнасці (у межах 15—75 працэнтаў), а таксама па... хуткасці руху паветра ў вытворчых памяшканнях. Прынамсі, гэта хуткасць павінна складаць 0,1-0,2 метра ў секунду.

### НА ДУШАВЫЯ СВОЙ «СТАНДАРТ»

Асобная гаворка аб памяшканнях невытворчых. Тут — свае правілы. Скажам, лічыцца, што ў зімовы перыяд разліковая тэмпература ў вестыбюлях, гардэробах вулічнага адзення, памяшканнях для рамонту спецадзення і спецабутку, памяшканнях для абяспыльвання спецадзення, прыбіральнях і курыльных пакоях не павінна быць ніжэйшай за «плюс» 16 градусаў, у памяшканнях для адпачынку — за «плюс» 22, у гардэробах спецадзення і памяшканнях асабістай гігіены жанчын — 23, а слупок тэрмометра ў душавых пакоях не можа апускацца ніжэй адзнакі 25 градусаў па Цэльсію.

### ЗВАЖАЙ НА ГРАДУС

Аднак не сакрэт, што «стандарты» вытрымліваюцца не заўсёды. У сувязі з гэтым, зазначае **галоўны тэхнічны інспектар працы Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Аляксандр ЗАЙЦАЎ,** у вытворчых памяшканнях, дзе дапушчальныя нормы з прычыны тэхнічных патрабаванняў або эканамічнай мэтазгоднасці не выконваюцца, умовы працы трэба разглядаць як шкодныя ці небяспечныя. А для мінімізацыі іх наступстваў неабходна выкарыстоўваць спецыяльныя абарончыя мерапрыемствы — павелічэнне працягласці водпуску, перапынкі ў працы, скарачэнне працоўнага дня.

Дарэчы, варта адзначыць, што ўлетку працягласць змены «сядзячых» работнікаў пры тэмпературы ў вытворчых памяшканнях «плюс» 28,5 градуса скарачаецца да 7 гадзін, пры тэмпературы 29 градусаў — да 6, пры тэмпературы 30 градусаў — да 5, пры тэмпературы 31 градус — да 3, пры 32 градусах — да 2, а пры тэмпературы 32,5 градуса — і ўвогуле да 1 гадзіны. Узімку ж тэмпература «плюс» 19 градусаў можа зменшыць змену «сядзячых» работнікаў да 7, 18 градусаў — да 6, 17 градусаў — да 5, 16 градусаў — да 4, 15 градусаў — да 3, 14 градусаў — да 2, а «плюс» 13 градусаў — да 1 гадзіны.

Аднак варта заўважыць, што падобныя «рамкі» існуюць не для ўсіх. Напрыклад, для работнікаў, якія займаюцца пастаянным перасоўваннем, перамяшчэннем ці пераноскай прадметаў вагой больш за 10 кілаграмаў і прыкладаюць вялікія фізічныя намаганні, правілы ўжо іншыя. Так, улетку «плюс» 26,5 градуса можа зменшыць змену такіх работнікаў да 7 гадзін, 27 градусаў — да 6, 28 градусаў — да 5, 28,5 градуса — да 4, 29 градусаў — да 3, 30 градусаў — да 2, а 30,5 градуса — да 1 гадзіны. Адначасова ў зімовы перыяд года для гэтых катэгорый змяншэнне змены да 7 гадзін магчымае толькі пры сярэдняй тэмпературы на працоўным месцы ў 12, да 6 гадзін — пры тэмпературы ў 11, да 5 гадзін — пры тэмпературы 10, да 4 гадзін — пры тэмпературы — 9, да 3 гадзін — пры тэмпературы 8, да 2 гадзін — пры тэмпературы 7 і да 1 гадзіны — пры тэмпературы 6 градусаў цяпла.

### НЯМА НОРМЫ. ШТО РАБІЦЬ?

Як заўважае Аляксандр Зайцаў, сёння тэмпературны рэжым знаходзіцца пад асаблівым кантролем Федэрацыі прафсаюзаў, прычым апошнім часам парушэнні патрабаванняў да мікраклімату адзначаюцца сапраўды радзей. Значная колькасць наймальнікаў разумее, што больш выгадна ўкласці грошы ў ацяпленне ці кандыцыянаванне вытворчых памяшканняў, чым мець значныя страты працоўнага часу з-за хваробаў персаналу. Аднак гэта перш-наперш датычыцца буйных прадпрыемстваў, дзе актыўна купляюць ацяпляльныя прыборы, «зімовае» спецадзенне і спецабутак, нават электрачайнікі і мікрахвалёўкі для пакояў адпачынку. Разам з тым раз-пораз пытанні ўзнікаюць наконт арганізацый дробных — асабліва тых, дзе няма ўласных прафкамаў.

— У такім разе ініцыятыву могуць узяць на сябе самі работнікі, — зазначае Аляксандр Зайцаў. — Адно, што асабіста я не раіў бы выносіць рашэнне самастойна, скажам, адвольна скарачаць сабе змену ў сувязі з занадта нізкай або высокай тэмпературай. Тут неабходна заключэнне спецыялістаў. А для гэтага можна звярнуцца ў органы санітарнага нагляду, дзяржаўную інспекцыю працы або ў прафсаюзы.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

## «АБМЕННІК» АБАКРАЎ КРЫМІНАЛЬНЫ «КВАРТЭТ»

РАСКРЫТЫ ДЗЁРЗКІ КРАДЗЕЖ З ПУНКТА АБМЕНУ ВАЛЮТ ВА ЎНІВЕРСАМЕ «ЦЭНТРАЛЬНЫ»

**Пра гэта карэспандэнту «Звязды» паведаміў начальнік аддзялення інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр ЛАСТОЎСКІ. Сталічныя сышчыкі адшукалі і затрымалі злачынную групу, удзельнікі якой 18 снежня мінулага года за некалькі хвілін змаглі пранікнуць у пункт абмену валюты ЗАТ «Абсалютбанк», калі касір была на абедзе, і спустошыць сейф — адтуль знікла 64 мільёны рублёў.**

Шукаць крымінальніка было няпроста: яны на месцы здарэння не пакінулі ніякіх слядоў. Тым не менш, карпатлівая праца, праведзеная сумесна супрацоўнікамі мінскага крымінальнага вышуку, экспертна-крыміналістычнай службы, спецыялістамі МУС, дала плён — праваахоўнікам удалося ўзнавіць карціну злачынства. Як выявілася, да яго мелі дачыненне чацвёра маладых людзей, двое з якіх працавалі ў «ЗАТ «Абсалютбанк», а яшчэ двое — раней судзімыя грамадзяне.

Да дзёрзкага крадзяжу, паводле слоў нашага суразмоўцы, крымінальны «квартэт» рыхтаваўся доўга — на працягу месяца. Зламыснікі дэталёва вывучалі раён, месца будучага злачынства, графік працы «абменніка». Што датычыцца супрацоўнікаў банка, то ў іх задачу ўваходзіла вырашэнне ўсіх пытанняў па магчымасці імгненнага пранікнення ў пункт абмену валюты. А вось двое іншых грамадзян, якія не на словах знаёмыя з Крымінальным кодэксам, павінны былі ўчыніць крадзеж, не пакінуўшы на месцы ніякіх слядоў для сышчыкаў.

Тым не менш, канчаткова заблытаць сляды і ўцячы ад следства ў іх не атрымалася: пры актыўным садзейнічанні супрацоўнікаў «Абсалютбанка» міліцыя затрымала трох членаў злачыннай групы. Між іншым, чацвёртага крымінальніка затрымалі ля трапа самалёта ў адным з маскоўскіх аэрапортаў — ён вяртаўся з Егіпта, дзе, відаць, адпачываў на выкрадзеныя грошы. Цяпер следствам высвятляецца, ці маюць дачыненне затрыманыя да ўчынення іншых падобных злачынстваў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ПРАДАЛІ Ў 10 РАЗОЎ ТАННЕЙ...

**Праваахоўнікі хутка раскрылі крадзеж абсталявання з катэджа ў раёне праезду «Дразды» па слядах, якія пакінуў на месцы здарэння падазроны.**

Невядомыя ўмудрыліся за ноч скрасці з дома, які будуецца, газавы кацёл і ўстаноўку, кошт якіх складае каля 24 мільёнаў рублёў. Паводле звестак прэс-афіцэра Цэнтральнага РУУС Кацярыны Лісоўскай, уладальнікам катэджа з'яўляецца індыйскі грамадзянін, а на будоўлі працавала брыгада беларускіх рабочых, адзін з якіх, як выявілася, і паквапіўся на чужое дабро. Апошні, ведаючы, што па вечарах у катэджы нікога не застаецца, прыйшоў туды з памагатымі, якія пагрузілі абсталяванне ў мікрааўтобус і вывезлі. Хутка раскрыць злачынства дапамаглі сляды спартыўнага абутку на месцы здарэння, на якія звярнулі ўвагу следчыя: такі абутак насіў толькі адзін з рабочых брыгады. Да таго ж, ён пасля крадзяжу не з'явіўся і на працы... Выкрадзенае ж абсталяванне праваахоўнікі адшукалі ў адным з дамоў у Гомельскай вобласці. Між іншым, частка абсталявання была ўжо прададзеная, прычым па кошце, у 10 разоў ніжэйшым за рэальны.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## ВАРТАЎНІК — ЗЛОДЗЕЙ

**З тэрыторыі фермы ААТ «Ружаны-Агра» ў в. Варанілавічы (Пружанскі раён) зніклі дзве аўтамашыны «МАЗ», з якіх адна была новай.**

Крадзеж арганізаваў 30-гадовы вартаўнік гэтай жа фермы, які ў кампанію ўзяў 22-гадовага хлопца. Адну аўтамашыну знайшлі ў кювеце, а другую ў в. Паўлава, дзе жывуць зладзеі.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## КАНТРАБАНДНАЯ ЦЯЛЯЦІНА

**Увагу супрацоўнікаў міліцыі, дзяржкамітэта і УКДБ па Брэсцкай вобласці прыцягнуў «Форд-Транзіт», які стаяў на вул. Барысаўскай у Кобрыне.**

У аўтамашыне, якая належыць жыхару ўкраінскага горада Ковель, знаходзілася цяляціна — 50 туш. Мяса пацягнула на 25 мільёнаў рублёў. Цяляціну канфіскавалі, бо яна была завезена на тэрыторыю Беларусі кантрабандай.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

## МАЛАТКОМ ПА ПАТРОНЕ

**цюкнуў жыхар Рэчыцы, які пражыў на свеце ўжо 38 гадоў. У выніку адбыўся стрэл і куля трапіла ў жывот самадзейнага сапёра.**

Па версіі пацярпелага ад уласных дзеянняў, малакаліберны патрон ён знайшоў на тэрыторыі сядзібы свайго бацькі ў вёсцы Зялёная паляна Чачэрскага раёна. Аднак, як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, пры аглядзе дома і тэрыторыі не было знойдзена боепрыпасаў або зброі. А вось у аўтамашыне грамадзяніна знойдзены яшчэ адзін патрон 5,6 мм. Відаць, для працягу эксперыментаў.

## ЖЫЦЦЁ АБАРВАЎ «ГРУКАТ»

**Загінуў на вытворчасці 54-гадовы рабочы друзавага завода «Глушкавічы», што ў Лельчыцкім раёне.**

Мужчына атрымаў цяжкія цялесныя пашкоджанні пры падзенні сілавога агрэгата «Грукат».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ХТО ГАСПАДАР АЎТО?

**Віцебск летась пазбавілі амаль ад 300 старых аўтамабіляў, якія гадамі без колаў, з адчыненымі дзверцамі стаялі ў дварах.**

Цікава, што пасля таго, як гаспадароў фактычна ўжо не прыдатных да эксплуатацыі аўто знаходзілі, каля 80 працэнтаў з іх ліку самі займаліся арганізацыяй эвакуацыі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

*Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by*

## Дзмітрый Мядзведзеў напісаў адказ на пісьмо Аляксандра Лукашэнкі па пытаннях паставак нафты

**Прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў напісаў адказ на пісьмо Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі па пытаннях паставак нафты. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе Крамля.**

Змест паслання расійскага прэзідэнта ў прэс-службе не раскрылі, адзначыўшы толькі, што ў ім змяшчаецца інфармацыя аб умовах паставак расійскай нафты ў Беларусь. У прэс-службе Крамля таксама дадалі, што сваё пісьмо Дзмітрый Мядзведзеў накіраваў 17 студзеня.

## Уладзімір Макей правядзе кансультацыі з членамі Грамадска-кансультацыйнага савета

Старшыня Грамадска-кансультацыйнага савета (ГКС) пры Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей плануе правесці кансультацыі з членамі савета аб магчымасці і парадку будучай работы ГКС.

Як паведаміў карэспандэнту БЕЛТА сакратар ГКС Уладзімір Шпакоўскі, на сустрэчу з Уладзімірам Макеем, якая адбудзецца ў найбліжэйшы час, запрошаны Станіслаў Багданкевіч, Жанна Грынюк, Алег Гулак, Юрый Зісер, Сяргей Мусіенка, Алег Трусаў і іншыя члены савета.

## Беларусь накіравала Тайланду ноту з просьбай аб садзейнічанні ў вызваленні беларускага грамадзяніна

«19 студзеня праз дыпламатычную місію Казахстана ў Тайландзе намі атрымана інфармацыя, якая пацвярджае чарговае прадаўжэнне тайскімі судовымі ўладамі тэрміну знаходжання членаў экіпажа Іл-76 пад вартай на 12 дзён», -- адзначыў БЕЛТА **прэс-сакратар беларускага знешнепалітычнага ведамства Андрэй ПАПОЎ**. Прымаюцца ўсе магчымыя ў рамках міжнароднага права меры, накіраваныя на абарону інтарэсаў нашага грамадзяніна. МЗС Беларусі знаходзіцца ў пастаянным узаемадзеянні з калегамі з дыпламатычнай місіі Казахстана ў Бангкоку.

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.01.2010 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 842,00 |
| 1 еўра | 4 094,481 |
| 1 латвійскі лат | 5 771,14 |
| 1 літоўскі літ | 1 184,86 |
| 1 чэшская крона | 158,50 |
| 1 польскі злоты | 1017,87 |
| 1 расійскі рубель | 96,28 |
| 1 украінская грыўня | 351,52 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанка РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 29,5184 |
| UAH | 36,6006 |
| 1000 BYR | 10,3828 |
| EUR | 42,5094 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

ISSN 1990 - 763X

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗАМЕЖНЫЯ СМІ ЛІЧАЦЬ ЛІДАРСТВА ЯНУКОВІЧА ІЛЮЗІЯЙ



**Ва Украіне апрацавана 99,9% пратаколаў участковых выбарчых камісій: разрыў паміж пераможцамі першага тура прэзідэнцкіх выбараў Віктарам Януковічам і Юліяй Цімашэнкай складае 10,3 %. Лідару Партыі рэгіёнаў аддадзена 35,34 % галасоў, кіраўніку БЮЦ — 25,04 %. Тым не менш, заходняя прэса прадракае ў другім туры выбараў перамогу Цімашэнка.**

За ходам прэзідэнцкай барацьбы ва Украіне працягваюць пільна сачыць заходнія СМІ. Артыкул у брытанскай The Financial Times спрабуе звязаць прагнозы па другім туры выбараў ва Украіне з іміджам Януковіча. Чакаецца, што на наступным этапе харызматычная Цімашэнка прыцягне ў свой лагер прыхільнікаў кандыдатаў, якія выбылі з гонкі, а Януковічу гэта зрабіць цяжэй, нягледзячы на тое, што ён з 2004 года, як пішуць карэспандэнты, стаў больш стыльным дзякуючы парадам амерыканскіх паліттэхнолагаў: модныя касцюмы і стрыжка, у інтэрв'ю — сціслыя трапныя адказы замест доўгіх маналогаў. На харызму Цімашэнкі ў другім туры ставяць і аналітыкі AP. У артыкуле агенцтва, апублікаваным у The New York Times, таксама гаворыцца, што за цяперашняга прэм'ера напэўна прагаласуе большасць тых, хто раней аддаў перавагу 16-ці іншым кандыдатам. Таму магчыма, што 10-працэнтная перавага Януковіча ў першым туры — толькі ілюзія, робяць выснову палітолагі. СМІ адзіныя ў меркаванні, што хто б ні выйграў гонку, ён сутыкнецца з велічэзнымі фінансавымі праблемамі.

### ФРАНЦЫЯ АБВІНАВАЦІЛА АМЕРЫКАНЦАЎ У АКУПАЦЫІ ГАІЦІ

**І папрасіла ААН удакладніць ролю амерыканцаў.**

Прыняўшы на сябе функцыі дыспетчараў у аэрапорце Порт-а-Прэнса, вайскоўцы ЗША аддаюць прыярытэт уласным ваенным рэйсам, іншым жа самалётам, у тым ліку з жыццёва неабходнымі гуманітарнымі грузамі, не даюць пасадку, паведамляе дзяржсакратар па справах супрацоўніцтва і франкафоніі Ален Жуаяндэ. З аналагічнымі папрокамі выступіла міжнародная арганізацыя «Урачы без межаў», якая базіруецца ў Жэневе. Яе прадстаўнікі заявілі, што, «заварочваючы» самалёты з дапамогай, амерыканцы ставяць пад пагрозу смерці сотні пацыентаў гаіцян, піша брытанская The Daily Telegraph. Прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес таксама заявіў, што ЗША скарысталіся землятрусам як падставай для паўзучай акупацыі Гаіці. «Яны ўзброеныя так, як быццам накіроўваюцца на вайну», — заявіў Чавес. Ён параіў накіроўваць у зону бедства медыкаў, лекі, паліва і палявыя шпіталі, а не салдатаў.

### З ЗАВОДА ВЫКРАЛІ 100 КІЛО ЗОЛАТА

У Францыі чацвёра ўзброеных рабаўнікоў пракраліся на тэрыторыю плавільнага завода непадалёк ад Ліёна і вынеслі больш як 100 кілаграмаў золата. У цэх па перапрацоўцы каштоўных металаў яны трапілі пасля таго, як узялі ў закладнікі аднаго з супрацоўнікаў прадпрыемства. Дарэчы, гэты завод рабуюць у другі раз за тры гады.

### ГУЛЬТАЯВАТЫМ НЯМЕЦКІМ БЕСПРАЦОЎНЫМ — ШТРАФ

**Прэм'ер-міністр зямлі Гессэн Роланд Кох прапанаваў цэнтрам занятасці штрафаваць беспрацоўных, якія адмаўляюцца ад прапанаваных ім вакансій, аддаючы перавагу дзяржаўнай дапамозе, паведамляе Spiegel.**




«Шматлікія цэнтры занятасці адмаўляюцца ад санкцый, асцерагаючыся і без таго шматлікіх судовых цяжбаў з беспрацоўнымі», — заявіў Кох, дадаўшы, што ў такім разе федэральную службу занятасці неабходна абавязаць штрафаваць адмоўнікаў.

# КАТАЛІЗАТАР АБСЕ

*Падчас свайго старшынства Казахстан мае намер актывізаваць працу арганізацыі*

— Апошнія гады ў АБСЕ адбываюцца павольныя працэсы, — адзначыў падчас сустрэчы з журналістамі **Пасол Казахстана ў Беларусі Анатоль СМІРНОЎ,** — і самая галоўная задача Казахстана — актывізаваць працу гэтай арганізацыі.

— Першапачаткова мы ставілі задачу правесці саміт АБСЕ ў Астане, але цяпер Казахстан не настойвае прынцыпова на тым, каб правесці яго на сваёй тэрыторыі, — зазначыў дыпламат.

Паводле слоў дыпламата, ініцыятыва сустрэтая пазітыўна, і Беларусь яе падтрымала адной з першых. Спадар Смірноў нагадаў, што з 1999 года ў рамках АБСЕ не праводзілася мерапрыемстваў на найвышэйшым узроўні.

У планах — забяспечыць роўнае напаўненне ўсіх трох вымярэнняў (нагадаем іх: ваенна-палітычнае, эканоміка-экалагічнае і чалавечае), кіравацца прынцыпамі ініцыявання і падтрымкі механізмаў глабальнай бяспекі, інтэграцыі паміж дзяржавамі, фарміравання дзейных пляцовак для дыялогу.

Папярэджанне і мірнае ўрэгуляванне канфліктаў будзе заставацца ключавым пытаннем у час казахстанскага старшынства.

Сярод прыярытэтаў Казахстана ў невеенных аспектах бяспекі — перш за ўсё супрацьдзеянне новым выклікам і пагрозам. Казахстан мае намер цесна супрацоўнічаць з Антытэрарыстычным падраздзяленнем Сакратарыята. Мяркуецца правесці ў Астане Канферэнцыю па папярэджанні тэрарызму.

— Сёння паняцце «еўрапейская бяспека» выходзіць далёка за кантынентальныя рамкі, ахопліваючы вялізную прастору Еўразіі. У гэтай сувязі Казахстан мае намер надаць асаблівую ўвагу Афганістану.

— Улічваючы, што на працягу апошніх гадоў невысокая эфектыўнасць Арганізацыі на эканоміка-экалагічным кірунку з'яўляецца прадметам усеагульнай заклапочанасці, Казахстан мае намер прыкласці неабходныя намаганні для выраўноўвання балансу паміж трыма «карзінамі» і актывізаваць работу па эканоміка-экалагічным вымярэнні. Перш за ўсё мы выступаем за актывізацыю дыялогу па транзітна-транспартным узаемадзеянні.

Беларусь, дарэчы, возьме самы непасрэдны ўдзел у вырашэнні ўсіх гэтых пытанняў. Па-першае, таму што чарговая (другая па ліку) падрыхтоўчая канферэнцыя да Эканоміка-экалагічнага форуму АБСЕ пройдзе ў беларускай сталіцы. І адбудзецца гэта сёлета ў сакавіку. Па-другое, рашэннем дзейнага старшыні пастаянны прадстаўнік Беларусі ў АБСЕ Аляксандр Сычоў прызначаны старшынёй Эканамічнага і экалагічнага камітэта АБСЕ.

Асноўнай тэмай старшынства Казахстана на экалагічным кірунку стане стварэнне механізмаў маніторынгу і прэвентыўнага рэагавання на экалагічныя пагрозы на прыкладзе катастрофы Аральскага мора як мадэлі пагрозы рэгіянальнай бяспецы.

Не знікне з поля зроку і трэцяе — чалавечае — вымярэнне:

— Надаючы вялікую ўвагу гэтаму вымярэнню, мы дэманструем цвёрдую прыхільнасць гэтаму працэсу, перш за ўсё ва ўласнай краіне. Наступныя крокі Казахстана ў галіне дэмакратызацыі будуць у поўнай меры карэспандзіравацца з мэтамі і задачамі, якія мы паставілі перад сабой у рамках старшынства.

Ад глабальнага — да індывідуальнага. Кожны млын усё ж на сваё кола ваду цягне, дык чаго нам самім чакаць ад старшынства нашага партнёра ў АБСЕ? Разлічваць можна на візавыя паслабленні з еўрапейскімі краінамі. Візавыя пытанні Анатоль Смірноў назваў адной з галоўных тэмаў, якімі будзе займацца Казахстан падчас свайго старшынства:

— Сёння гэта жыццёвае пытанне для жыхароў усіх краін у зоне адказнасці АБСЕ. На 2010 год намечаны шэраг мерапрыемстваў па спрашчэнні візавага рэжыму са шмат якімі краінамі, думаю, што ў зону вырашэння гэтага пытання ўваходзіць і Беларусь.

Дыпламат таксама паведаміў пра актыўную прапрацоўку пытання аб пастаўках казахстанскай нафты на беларускія нафтаперапрацоўчыя заводы.

— Раней сур'ёзнай перашкодай былі высокія тарыфы на транспарціроўку. І сёння, калі ўтвораны Мытны саюз, мяркую, нам адкрываюцца перспектывы для таго, каб пракачваць нафту на вашы НПЗ, перапрацоўваць яе тут і далей транспартаваць у краіны ЕС.

Ад гэтай ідэі, паводле слоў дыпламата, ніхто не адмаўляецца, тым больш што яна знайшла адлюстраванне ва ўсіх дакументах, а пытанне знаходзіцца на самым высокім кантролі. Размова ідзе пра пастаўкі на два беларускія НПЗ, і, на думку пасла, пытанне будзе вырашанае ўжо сёлета. Ён толькі дыпламатычна заўважыў, што нашым НПЗ, мабыць, варта праводзіць мадэрнізацыю і павялічваць магутнасць, бо рост здабычы нафты ў Казахстане ўжо дасягнуў 70 млн тон (і гэта пры патрэбе краіны ў прыкладна 10 млн тон). «Так што праблемы дэфіцыту для паставак на беларускія НПЗ у нас няма», — зрабіў заключэнне Анатоль Смірноў.

У казахстанскага боку няма сумненняў у перавагах Мытнага саюза і ў тым, што абраны шлях — да адзінай эканамічнай прасторы — правільны.

— ЕС на гэта спатрэбілася 50 гадоў, але краіны постсавецкай прасторы, думаю, больш хутка прыйдуць да вырашэння гэтага пытання, і ў 2012 годзе адзіная эканамічная прастора будзе ўжо дзейнічаць.

Дыпламат параіў не зацыклівацца на нейкім адным аспекце (скажам, на аўтамабілях), а ацэньваць у цэлым — агульныя магчымасці і перспектывы.

— У рамках Мытнага саюза было ўзгоднена 11 тыс. таварных пазіцый. 7 працэнтаў ішлі на павелічэнне мытных тарыфаў, але ж 18 працэнтаў — на змяншэнне, і 75 працэнтаў — засталіся на ўзроўні. Вядома ж, нейкія пытанні будуць... Але ж увогуле адкрываецца вельмі шырокае поле для сумеснай дзейнасці — стварэнне сумесных прадпрыемстваў, транспарціроўка грузаў, сыравіны, адкрываецца велізарны рынак.

Больш як 30 праектаў (на суму каля 20 млрд долараў) па індустрыяльнай праграме развіцця Казахстана будуць рэалізаваныя з удзелам Беларусі.

— Гэта амаль 50 працэнтаў усіх праектаў, — падкрэсліў пасол, — гэта сведчыць пра многае.

А сумесна створаная прадукцыя знойдзе шырокі рынак рэалізацыі па ўсёй Азіі. Такім чынам, ёсць усе перадумовы да павелічэння ўзаемнага тавараабароту — ужо ў наступныя два-тры гады ён можа дасягнуць трох млрд долараў, — мяркуе кіраўнік дыпмісіі.

**Ала МАЧАЛАВА.**

**ФИЛИАЛ «ЦЕНТР «БЕЛТЕХИНВЕНТАРИЗАЦИЯ»**
объявляет о изменениях к рекламному объявлению, опубликованному в газете «Звезда» от 22.12.2009 г. № 242 о проведении аукциона по продаже права на заключение договора аренды торговых мест, принадлежащих ЧПУП «Инвестпромгрупп» 22 января 2010 г. и сообщает, что **по лоту № 4 площадь торгового объекта составляет 12,4 кв. м.**
**Контактные телефоны: (0232) 77 52 78, 77 52 87.**
УНП 102353509.

## ДЗЕЦІ І ПРЫГАЖОСЦЬ

**Міс Ірландыі пабывала ў дзіцячым доме-інтэрнаце ў Глускім раёне.**

**Шармэйн Келі** — 27-гадовая ірландка, якую ў 2009 годзе прызналі самай прыгожай у краіне. У межах дабрачыннай місіі яна наведала Веснаўскі дом-інтэрнат, дзе цяпер жывуць 145 дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.

— Яна вельмі таварыская, — расказаў **дырэктар дома-інтэрната Вячаслаў КЛІМОВІЧ.** — Добра паставілася да нашых дзяцей: не грэбліва, а вельмі добразычліва. Яна ў зносінах нічым не адрознівалася ад іншых людзей, толькі што карона на галаве ды стужка «Міс Ірландыя».

Больш за палову дня правяла Шармэйн з веснаўскімі дзецьмі. Размаўляць даводзілася праз перакладчыка: толькі два хлопчыкі, якія ездзілі на аздараўленне ў Ірландыю, падтрымалі гутарку на замежнай мове і ўзгадалі свае вакацыі. Ды і многім выхаванцам школы-інтэрната мова не вельмі важная: яны, як кажуць, размаўляюць душой.

Ірландскі праект дапамогі дзецям Чарнобыля дапамог Веснаўскаму дому-інтэрнату з бягучым рамонтам і фінансаваў аздараўленне дзяцей у Беларусі і за яе межамі. Дабрачыннасць ірландцы лічаць ганаровай справай, і доказ гэтаму — прыезд Міс Ірландыі да хворых дзяцей.

Малым патрэбна не толькі матэрыяльная дапамога, але і зносіны. У Веснаўскім доме-інтэрнаце пакуль не бачылі беларускіх прыгажунь і ўвогуле славутых людзей краіны, але шчыра запрашаюць іх да сябе ў госці.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Абзац

◢ **Колькасць жыхароў Еўрапейскага саюза па стане на пачатак года ўпершыню перавысіла 500 млн чалавек. Такія звесткі распаўсюдзіў учора французскі Нацыянальны інстытут статыстычных даследаванняў. Год таму агульная колькасць насельніцтва краін ЕС была роўная 499,8 млн чалавек. Найбольш населенай краінай у ЕС з'яўляецца сёння Германія з 81,7 млн насельніцтва. На другім месцы — Францыя, на якую прыпадае 13 % агульнай колькасці насельніцтва, яе паказчык роўны 64,7 млн. Трэцяе месца займае Вялікабрытанія з 62 млн чалавек.**

◢ Крымінальную справу былога кіраўніка адміністрацыі Кастрычніцкага раёна Мінска Міхаіла Цыгана будзе разглядаць Мінскі абласны суд, паведамілі БЕЛТА ў Вярхоўным судзе Беларусі. Яму інкрымінаванае атрыманне хабару ад прадстаўнікоў камерцыйных арганізацый і іншых асобаў, перавышэнне ўлады і службовых паўнамоцтваў, крадзеж грашовых сродкаў шляхам злоўжывання службовымі інтарэсамі.

◢ **Жыхар Жабінкі спрабаваў збыць сувенірную 100-доларавую купюру. Ён быў затрыманы міліцыяй у в. Здзітава. Малады чалавек 1990 г.н. спрабаваў абмяняць сувенірную купюру на Br250 тыс. Заведзена крымінальная справа. Як сведчаць праваахоўнікі, гэта даволі рэдкі выпадак. Вельмі рэдка зламыснікі асмельваюцца выдаваць за сапраўдную банкноту сувенірную паперку, а не падробленую купюру.**

## Поўны абзац

◢ У Кітаі сямейная пара заключыла шлюбны кантракт на права жонкі біць мужа адзін раз на тыдзень. Такі незвычайны кантракт заключылі сямейнікі ў горадзе Чуньцін. Жонка, якая валодае прыёмамі баявых мастацтваў, пастаянна біла свайго маладога мужа, нават па нязначных прычынах. Каб захаваць шлюб, маладыя людзі заключылі пагадненне — жонцы дазволена біць мужа толькі раз на тыдзень. У выпадку, калі жанчына будзе распускаць рукі часцей, яна павінна будзе пераехаць на 3 дні да сваіх бацькоў. Па словах жонкі, яна шкадуе аб зробленым кожны раз, калі бачыць на твары мужа вынік свайго гневу, аднак шчыра спадзяецца, што пагадненне дапаможа зрабіць нораў больш лагодным.

◢ **Сетка гатэляў адправіць сваіх супрацоўнікаў грэць пасцелі кліентаў. Да тых, хто замовіць паслугу саграванне пасцелі ў Holiday Inn, будуць прыходзіць апранутыя ў спецыяльныя касцюмы супрацоўнікі гатэля, якія на працягу 5 хвілін напоўняць ложак цяплом і забяспечаць кліенту камфортны сон. Гэта незвычайная ідэя будзе апрабаваная ў гатэлях Лондана і Манчэстэра ўжо ў канцы студзеня. Як сведчаць спецыялісты, цёплая пасцель (20—24 градусы па Цэльсію) — выдатны спосаб хуткага засынання, у той час як халодная затармажвае яго.**

***Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.***

# Беларускае малако са стандартамі Еўрасаюза

Ва Урадзе

**У Беларусі падрыхтаваны новы тэхнічны рэгламент на малако і малочную прадукцыю, які адпавядае еўрапейскім стандартам, і фактычна малочная галіна нашай краіны пацягне за сабой тэхнічныя рэгламенты дзяржаў Мытнага саюза з магчымасцю экспартаваць малочную прадукцыю ў ЕС. Па сутнасці, зроблена яшчэ некалькі крокаў наперад, каб быць экспартна-арыентаванай краінай па малочнай прадукцыі ўжо за межы мытнай прасторы.**

На пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, на якім разглядаўся праект тэхнічнага рэгламенту «Малако і малочная прадукцыя. Бяспека», **прэм'ер-міністр Сяргей СІДОРСКІ** адзначыў, што нашай краінай закладзеная аснова для таго, каб сёлета айчынная прадукцыя была на самым высокім узроўні па сертыфікацыі і стандартызацыі. «Самае галоўнае для нас, — лічыць кіраўнік Урада, — выхад на рынкі Еўрасаюза, каб пастаўкі ў гэтыя краіны ажыццяўляліся не адзінкавымі партыямі, а рэгулярна, пры гэтым у працэсе павінна быць задзейнічанае кожнае прадпрыемства».

У аснову беларускага праекта тэхрэгламенту, праінфармаваў **першы намеснік старшыні Дзяржстандарта Віктар НАЗАРАНКА,** пакладзеныя заканадаўчыя акты Еўрапейскага саюза ў галіне бяспекі харчовых прадуктаў і расійскі тэхнічны рэгламент на малако і малочную прадукцыю. Пры тым новы тэхрэгламент вызначае не толькі патрабаванні да бяспекі малака і малочнай прадукцыі, але і да працэсаў іх вытворчасці, захоўвання, перавозкі, рэалізацыі, а таксама правілах размяшчэння на рынку і нагляду за захаваннем патрабаванняў рэгламенту. Між іншым, значная частка паказчыкаў, вызначаных у тэхрэгламенце, ужо дзейнічае, яна вызначана ў санітарных нормах і правілах. Разам з тым, для шэрагу паказчыкаў бяспекі, згодна з патрабаваннямі еўрапейскага заканадаўства, вызначаныя больш жорсткія значэнні, калі параўноўваць іх з дзейнымі як у нас, так і ў Расіі. Сярод такіх Віктар Назаранка згадаў паказчыкі па ўтрыманні свінцу, афлатаксіну. Акрамя таго, значэнні дапушчальнага ўтрымання пестыцыдаў прыведзеныя ў адпаведнасць з еўрапейскімі нормамі, а для малака, вяршкоў і шэрагу прадуктаў пашыраная наменклатура падкантрольных пестыцыдаў.

Дарэчы, новы дакумент утрымлівае і патрабаванні, якія вызначаюцца ўпершыню. У прыватнасці, на падставе еўрапейскіх у беларускім тэхрэгламенце вызначаныя патрабаванні да ўтрымання рэшткавай колькасці фармацэўтычных ветэрынарных прэпаратаў у сырым малацэ. Як патлумачыў Віктар Назаранка, гарманізацыя паказчыкаў з патрабаваннямі ЕС і Расіі дазволіць забяспечыць неабходны ўзровень абароны спажыўцоў і стварыць умовы для экспарту айчыннай прадукцыі. Да размяшчэння ж на рынку малако і малочная прадукцыя павінны прайсці адпаведныя працэдуры пацвярджэння адпаведнасці ў выглядзе дэкларавання, ці сертыфікацыі ў такіх жа формах, як гэта прадугледжана ў Расіі. Пры гэтым суб'екты гаспадарання нашай краіны выбіраюць найбольш зручныя для іх схемы і формы пацвярджэння.

Новы тэхрэгламент прапаноўваецца ўвесці з пачатку наступнага года. Гэты ж год, паводле слоў першага намесніка старшыні Дзяржстандарта, павінен стаць годам пераходу на яго з мэтай безумоўнага выканання патрабаванняў новага тэхрэгламенту. У найбліжэйшы час, зазначыў ён, павінны быць узгодненыя і рэалізаваныя мерапрыемствы, якія забяспечаць пераход на тэхнічны рэгламент як на ўзроўні рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, так і на ўзроўні прадпрыемстваў.

**Ігар ШЧУЧЭНКА.**

На свае вочы

**Карэспандэнт «Звязды» на сабе паспытаў, што такое быць беларускім маржом і ці прыносіць вадахрышчанскае купанне ўнікальны эфект**



*Святая купель у Лагойску.*

# ЯК ПАСЛЯ ВАДОХРЫШЧАНСКАЙ ПАЛОНКІ Я ПЕРАЎТВАРЫЎСЯ Ў «ЛЕДАКОЛ»

Яўген ВАЛОШЫН.





**Так на марозе ў 15 градусаў купаюцца карэспандэнт Яўген ВАЛОШЫН (злева) і 7-разовы чэмпіён свету па тайскім боксе Віталь ГУРКОЎ.**

УСЕ беларускія газеты на Вадохрышча традыцыйна друкуюць фотаздымкі маржоў, якія ў сцюжу амаль голыя даюць нырца ў ледзяную палонку. Але ніхто з маіх знаёмых калег-журналістаў не падаўся ў халаднючую ваду — боязна. Таму я і вырашыў абараніць гонар беларускай журналістыкі і зведаць на ўласнай скуры, што такое купанне ў ледзяной палонцы. Добра, што кампаньён у мяне знайшоўся спрактыкаваны — сяміразовы чэмпіён свету па тайскім боксе Віталь Гуркоў. Высветлілася, што фізічную форму ён падтрымлівае не толькі 30-кіламетровымі прабежкамі і шматгадзіннымі трэніроўкамі, але і купаннем у зімовых палонках.

**Добра, што кампаньён у мяне знайшоўся спрактыкаваны — сяміразовы чэмпіён свету па тайскім боксе Віталь Гуркоў. Высветлілася, што фізічную форму ён падтрымлівае не толькі 30-кіламетровымі прабежкамі і шматгадзіннымі трэніроўкамі, але і купаннем у зімовых палонках.**

*— Калі пераступіш праз сябе, нырнеш, то адчуеш сябе сапраўдным асілкам, валуны пачнеш варочаць, — абяцаў чэмпіён. — Целам, думкамі зробішся новым чалавекам.*

Такім чынам, раніцай на Вадохрышча мы ехалі ў бок горада Лагойска, каб даць нырца ў знакамітай мясцовай купелі Святога Мікалая.

А восьмай ля тае самае святой купелі завіхаліся людзі з бутэлькамі, бутлямі і бідонамі, набіралі святую ваду. Кажуць, што вада, набраная з тутэйшай крыніцы на Вадохрышча, лечыць шматлікія хваробы.

Да будынка драўлянай купелі, дзе непасрэдна знаходзіцца палонка, выстраілася чарга чалавек у 20. Мароз быў сапраўды калядны — каля -15. Пастаяўшы ў чарзе каля 10 хвілін, кажу Віталю Гуркову наступнае:

*— Якая тут палонка? Пальцаў на нагах ужо не адчуваю. Калі акунуся ў ваду, дакладна акалею. Чуў, што ў вайну гітлераўцы забівалі людзей, абліваючы іх у такое надвор'е халоднай вадой...*

— Цярпі.

*— А можа, у купелі вада цёплая? Вунь якія шчаслівыя адтуль жанчыны выйшлі, твары чырвоныя, як у вараных ракаў.*

Але высветлілася, што ваду ў купелі ніхто не падаграваў, і мне не заставалася нічога іншага, як распранацца дагала. Мясцовыя купальшчыкі правялі інструктаж, што перад пагружэннем у ледзяную палонку трэба перажагнацца і пакланіцца святым абразам. А пасля купання — апрануць вопратку на мокрае цела, не выціраццa.

Першым у ваду палез Віталь Гуркоў і, фыркаючы, уздыхаючы, грузна апусціўся ў святую ваду... Мой фотаапарат не слухаўся, чамусьці тэхніка дала збой. Можа, таму, што святая купель у мароз запоўнілася густой парай ад нашых аголеных целаў і вады.

*— Памілуй мяне Божа і выратуй мяне!* — да глыбіні душы шчыра, ці не ўпершыню ў жыцці вырвалася з мяне. Халаднючая вада ўпілася ў цела тысячамі заледзянелых іголак, сэрца ледзь не выскачыла праз рэбры... Але я сумленна акунуўся роўна тры разы і вылез на сушу. З палонкі выйшаў абсалютна іншы чалавек, які і піша зараз гэты матэрыял.

Прыкладна праз хвіліну пачалося цёплае прышэсце ў цела, розум зрабіўся ясным, у душы трыумфавала любоў. І толькі пальцы на руках і нагах давалі зразумець, што я аголены стаю на марозе.

*— Асцярожна падымайся на...* — не паспеў папярэдзіць Віталь Гуркоў, і я бразнуўся са слізкай лесвіцы на локаць правай рукі. І цудам нічога на сабе не раструшчыў, толькі раскалоў трохсантыметровы слой лёду на адной з прыступак. І пры гэтым нават не вылаяўся — так на мяне паўздзейнічала святая вада.

*— Табе і валуны не трэба варочаць, моцы, як у сапраўднага ледаколу,* — падбадзёрыў мяне чэмпіён.

**А можа, у купелі вада цёплая? Вунь якія шчаслівыя адтуль жанчыны выйшлі, твары чырвоныя, як у вараных ракаў.**

Праз пяць хвілін, калі мы ўжо апранутымі ішлі да аўтамабіля, адбыўся яшчэ адзін прыход цеплыні ў арганізм. Цела напоўнілася яшчэ большай лёгкасцю і разуменнем сэнсу жыцця... Сапраўдны цуд!

*Мінск—Лагойск—Мінск.*



## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА

**Организатор аукциона: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, пр. Черняховского, 9**

| № лота | Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка | Функциональное назначение земельного участка | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения | Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона | Расходы, связанные с проведением аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 221288850260100054 площадью 0,1499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Пуща (повторный аукцион) | Для строительства и обслуживания жилого дома | Наличие централизованного водоснабжения | 776 588 | 77 600 бел. руб. р/с 3600314130016 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300971263, код платежа 04901, получатель платежа: Туловский сельский исполнительный комитет | 517 192 | 1 497 730 |
| | **Дата, время и место проведения аукциона – 09.02.2010 в 15.00, г. Витебск, пр.Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 03.02.2010 г. до 17.30.** | | | | | | |
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 221282913101000124 площадью 0,1499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Суйково, ул. Новая, 13 | Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома | Наличие централизованного водоснабжения | 1 032 698 | 103 300 бел. руб. р/с 3600314060014 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 150801239, УНП 300965239, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполнительный комитет | 498 609 | 2 048 252 |
| 2 | Земельный участок с кадастровым номером 221282913101000123 площадью 0,1499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Суйково, ул. Новая, 15 | Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома | Наличие централизованного водоснабжения | 1 033 368 | 103 300 бел. руб. р/с 3600314060014 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 150801239, УНП 300965239, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполнительный комитет | 498 609 | 2 048 252 |
| 3 | Земельный участок с кадастровым номером 221282909101000107 площадью 0,1499 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Зароновский с/с, д. Пестуница, ул. Заозерная, 15А | Земельный участок для строительства и обслуживания жилого дома | Наличие централизованного водоснабжения. Участок примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Участок находится в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос оз. Пестунское | 538 440 | 53 800 бел. руб. р/с 3600314060014 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 150801239, УНП 300965239, код платежа 04901, получатель платежа: Зароновский сельский исполнительный комитет | 498 609 | 2 048 252 |
| 4 | Земельный участок с кадастровым номером 221285908101000213 площадью 0,1912 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Мазоловский с/с, д. Лужесно, ул. Покровская, 9 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Ограничения: охранная зона линий, сооружений связи и радиофикации. Водоохранная зона вне прибрежной полосы р. Зап. Двина | 3 978 165 | 397 800 бел. руб. р/с 3600314090013 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: Мазоловский сельский исполнительный комитет | 590 838 | 2 048 252 |
| | **Дата, время и место проведения аукциона – 02.03.2010 г. в 15.00, г. Витебск, пр.Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 24.02.2010 г. до 17.30.** | | | | | | |
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 221284806101000156 площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Кировская, ул. Строителей | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Расположен в пригородной зоне г. Витебска. Имеется возможность подключения к сетям электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения. Ограничения: земли, находящиеся в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов (пруд № 13) | 2 220 254 | 222 000 бел. руб. р/с 3600314080010 в Витебском ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801259, УНП 300976663, код платежа 04901, получатель платежа: Летчанский сельский исполнительный комитет | 509 140 | 2 048 252 |
| 2 | Земельный участок с кадастровым номером 221284806101000157 площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Летчанский с/с, д. Кировская, ул. Строителей | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Расположен в пригородной зоне г. Витебска. Имеется возможность подключения к сетям электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения. Ограничения: земли, находящиеся в водоохранных зонах и прибрежных полосах водоемов (пруд № 13) | 2 221 877 | 222 100 бел. руб. р/с 3600314080010 в Витебском ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 150801259, УНП 300976663, код платежа 04901, получатель платежа: Летчанский сельский исполнительный комитет | 509 140 | 2 048 252 |
| 3 | Земельный участок с кадастровым номером 221288106601000044 площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Лятохи, пер. Строителей, 2 | Земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Наличие централизованного водоснабжения, участок находится в радиусе 500 метров от центра населенного пункта, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения: водоохранная зона вне прибрежной полосы реки Лучёса, охранная зона линии электропередач напряжением свыше 1000В | 934 834 | 93 400 бел. руб. р/с 3600314110010 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300962400, код платежа 04901, получатель платежа: Октябрьский сельский исполнительный комитет | 484 292 | 2 048 252 |
| 4 | Земельный участок с кадастровым номером 221288106601000045 площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Лятохи, пер. Строителей, 4 | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Наличие централизованного водоснабжения, находится в радиусе 500 метров от центра населенного пункта, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения: водоохранная зона вне прибрежной полосы реки Лучёса, охранная зона линии электропередач напряжением свыше 1000В, охранная зона магистрального трубопровода | 934 834 | 93 400 бел. руб. р/с 3600314110010 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300962400, код платежа 04901, получатель платежа: Октябрьский сельский исполнительный комитет | 484 292 | 2 048 252 |
| 5 | Земельный участок с кадастровым номером 221288106601000046 площадью 0,1500 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, д. Лятохи, пер. Строителей, 6 | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Наличие централизованного водоснабжения, участок находится в радиусе 500 метров от центра населенного пункта, примыкает к асфальтированным дорогам и улицам. Ограничения: водоохранная зона вне прибрежной полосы реки Лучёса | 934 834 | 93 400 бел. руб. р/с 3600314110010 в ф-ле № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 259, УНП 300962400, код платежа 04901, получатель платежа: Октябрьский сельский исполнительный комитет | 484 292 | 2 048 252 |
| | **Дата, время и место проведения аукциона – 10.03.2010 г. в 15.00, г. Витебск, пр.Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 03.03.2010 г. до 17.30.** | | | | | | |
| 1. | Земельный участок с кадастровым номером 221882206801000016, расположенный по адресу: Витебская обл., Городокский р-н, Вайханский с/с, д. Малое Лосвидо площадью 0,1563 га (повторный аукцион) | Для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) | Участок находится в радиусе 500 метров от центра населенного пункта. Ограничения: земли находятся в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы озера Лосвидо | 2 188 000 | 218 800 бел. руб. на р/с 3600316023797 в ф-ле № 207 ОАО «АСБ Беларусбанк», 211573, г. Городок, код 641, УНП 300066953, код платежа 04901, получатель платежа: Вайханский сельский исполнительный комитет | 644 980 | 2 048 252 |
| | **Дата, время и место проведения аукциона – 11.02.2010 г. в 15.00, г. Городок, ул. Пролетарская, 2, Городокский районный исполнительный комитет. Окончательный срок приема документов – 05.02.2010 г. до 17.30.** | | | | | | |

## ККУП «ВИТЕБСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР МАРКЕТИНГА» ПРОВОДИТ АУКЦИОН НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА

| № лота | Кадастровый номер, площадь и адрес земельного участка | Функциональное назначение земельного участка, срок аренды | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений. Ограничения использования земель | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) | Размер задатка и реквизиты для его внесения | Расходы по подготовке документации, необходимой для проведения аукциона | Расходы, связанные с провед. аукциона | Возмещение потерь сельскохозяйственного производства, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Земельный участок с кадастровым номером 221280600001000237 площадью 0,1088 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, юго-восточнее поселка Светлый, У-14. | Земельный участок для строительства и обслуживания административно-хозяйственного объекта и автостоянки. Срок аренды – 50 лет | Ограничения: земельный участок находится в водоохранной зоне водного объекта вне прибрежной полосы (водохранилище) | 553 637 | 55 363 бел. руб. на р/с 3602314000014 в филиале № 201 ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 259, УНП 300196132, код платежа 04002. Получатель платежа: финансовый отдел Витебского районного исполнительного комитета | 959 781 | 3 987 654 | – |

**Дата, время и место проведения аукциона – 23.02.2010 г. в 15.00, г. Витебск, пр.Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Окончательный срок приема документов – 17.02.2010 г. до 17.30.**

Аукционы проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории отсутствуют.

**Победитель аукциона обязан:** подписать протокол аукциона в день проведения аукциона, в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка оплатить предмет аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона.

В случае приобретения зем. участка в частную собственность – осуществить в двухмесячный срок после принятия решения о предоставлении ему земельного участка государственную регистрацию права собственности на земельный участок; получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение на строительство жилого дома; занять (освоить) земельный участок не позднее одного года после получения свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации права собственности на него. В случае приобретения права аренды не позднее 2-х рабочих дней после внесения платы за предмет аукциона, возмещения расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, возмещением расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, заключить с местным исполнительным комитетом договор аренды земельного участка. Договор аренды земельного участка и возникновение основанного на нем права аренды подлежат государственной регистрации.

**1. Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, пр. Черняховского, 9, ККУП «Витебский областной центр маркетинга».**

2. Для участия в аукционе приглашаются: при продаже земельного участка в частную собственность – граждане и юридические лица Республики Беларусь, при продаже права на заключение договора аренды земельного участка – граждане, индивидуальные предприниматели и юридические лица. Гражданин, юридическое лицо должны подать заявление об участии в аукционе и подписать соглашение с организатором аукциона. К заявлению прилагается:

- для граждан – копия документа, содержащего идентификационные сведения гражданина;

- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

- для представителей гражданина и индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

- для представителей или уполномоченных должностных лиц юридического лица – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

- заверенная банком копия платежного поручения о внесении задатка.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, индивидуальные предприниматели, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Граждане, юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задаток в размере, установленном для земельного участка с наибольшей начальной ценой. Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем.

3. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка.

4. В случае отказа или уклонения Победителя аукциона в установленный срок от внесения платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона, внесенный им задаток и затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, возврату не подлежат.

5. **Контактный тел.: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, www.vitinvest.biz , www.gki.gov.by.**

Заснавальнік — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

20 СТУДЗЕНЯ 2010 г. СЕРАДА № 2 (15605)

Журналіст мяняе прафесію

# КАНДЫДАТЫ Ў МАДЭЛІ

## Частка другая, першы занятак па дэфіле і візажы...

Ілья ЛАПАТО

**Каб разабрацца ў тонкасцях мадэльнага бізнэсу, спецкар «Звязды» Ілья Лапато пад выглядам патэнцыйнай мадэлі паступіў у адну з вядучых мадэльных школ сталіцы. Занатоўваючы свае назіранні, тры шматпакутныя месяцы ён спасцігаў мастацтва дэфіле, асновы касметыкі і фотатрэнінгу.**

**ПРЫГАЖУНЫ І ПАЧВАРЫ**

— Падыдзіце да мяне ўсе, хто лічыць сябе прыгожым, — упэўненым тонам сустрэў нас голас Максіма.

Мы сарамліва стаялі. Ніхто не хацеў выпячвацца і лезці наперад.

— Ведайце, — працягваў мужчынскі голас. — Я займаюся толькі з прыгожымі мадэлямі. Хто сябе такім не лічыць — да пабачэння.

За некалькі імгненняў, умомант стаўшы «прыгожымі і ўпэўненымі», група абступіла мужчыну з абодвух бакоў і падрыхтавалася слухаць. Мы ўжо не былі асобамі, мы сталі вучнёўскай масай.

— Першая асноўная ісціна: у мадэляў няма локцяў! — як адрэзаў Максім і паглядзеў на нас. — Ну як вы стаіце? Сапраўдная мадэль у развалачку не стаіць. Жывот у сябе, спіна прамая, грудзі наперад... Адна нага прамая, другая — сагнутая ў калені і як бы закрывае першую. Паказваю.

Мы старанна паўтаралі.

— Ісціна нумар два, — працягваў Максім, — сцёгны. Яны не павінны выпінацца, уцягніце іх у сябе, і не выпінайце жывот. Усе паспрабавалі? Вось так вы і павінны стаяць. Рукі!!! (нехта з нас учыніў страшнае — засунуў рукі ў кішэні) Рукі вымі, прыгажуня. На дыскатэку прыйшла? Калі не, то і паводзь сябе, як мадэль.

Затым нас падзялілі на дзве часткі, пасярэдзіне стаў Максім і яго памагатая Зоя.

— Мужчыны ў нас ёсць? — «вучоба» ад Макса працягвалася. Многія хлопцы вырашылі не рызыкаваць і выйшлі наперад. — Мужчыны на маіх занятках стаяць толькі ў першай лініі, зразумела? Пясочніца, станьце за хлопцамі.

Пясочніцай ветліва «ахрысцілі» малых дзяцей, якія лічачы сябе «мужчынамі», таксама імкнуліся наперад: прычым не толькі маленькія хлопчыкі, але і маленькія дзяўчаткі.

— Зоя, пачынаем.

Зоя, чарнявая дзяўчына мадэльнай знешнасці, апранутая ў шырокія джынсы, у адрозненне ад Максіма, выглядала больш прыветнай — ёй хацелася давяраць. Зоя паказала некалькі крокаў, якія мы павінны былі засвоіць.

— Паўтараем.

— А зараз вучымся хадзіць, — Зоя паказала прыём фірмовай паходкі ад сцягна. — Пачынаем: раз-два, тры-чатыры, пяць-шэсць, сем-восем, раз-паварот...

Тупалі мы пад музыку — тупалі хвілін сорак, а як быў скамандаваны адбой, змучаныя і шчаслівыя, што ўжо канец, мы выправіліся перапранацца.



**АПЕРАЦЫЯ «АПРАНІ БАРБІ» І ЗНАЙДЗІ СВОЙ СТЫЛЬ**

Навошта хлопцы ідуць у мадэлі? Зарабіць? Зрабіць імя? Стаць папулярнымі? Не ведаю, хто як, але большасць хлопцаў у нашай распранальні не зусім, мякка кажучы, адпавядалі стэрэатыпным стандартам мужчынскай прыгажосці: яны былі невысокага росту, праз аднаго курылі, мацюкаліся і... горбіліся. Адзінкі былі высокімі, падцягнутымі і са знешнасцю, якую можна было назваць мадэльнай. Але, паўтаруся, такіх было адзін-два. Ды і агенцтва, як высветліцца пазней, мела свае крытэрыі мужчынскай прыгажосці.

— А бабы сёлета вельмі нават нічога, — тры хлопцы завялі між сабой гутарку (як высветлілася, яны знаёмыя, бо наведваюць курсы для мадэляў ужо не першы сезон). — Стройныя сёлета козачкі, і ўсё пры іх, не тое, што мінулы раз. Добра, пацаны, мы пайшлі, а вы дуйце на касметыку... — і, парукаўшыся, зарагаталі.

Мы, хто на мадэльных курсах упершыню, яшчэ не ведалі, што заняткі, якія не падабаюцца, можна і прапусціць, смяшкоў «бывалых хлапцоў» не зусім зразумелі. Увогуле абставіны ў распранальні нельга было назваць прыветнымі: хлопцы пазіралі адзін на аднаго з асцярогай, вось толькі з чым яна была звязаная, я ў той дзень так і не зразумеў.

Лекцыю па візажы ў той вечар нам чытала Аксана Кірылаўна — майстар міжнароднага класа, іміджмэйкер-стыліст, кансультант нейкай крамы... Карацей, уладальніца шматлікіх рэгалій і званняў, якія яна пералічвала нам пад дыктоўку хвіліны дзве.

Сваё знаёмства Аксана Кірылаўна пачала з вельмі цікавага пытання і ў першую чаргу яно было цікавым мне: для чаго вы сюды прыйшлі?

Улічваючы ўсю разнароднасць прысутных (побач са мной сядзела дзяўчынка, якая чытала кнігу «Біялогія. 5-ы клас»), адказы былі самыя розныя. «Каб зарабіць грошы» (адказваў хлопец), «навучыцца правільна хадзіць», «умець правільна насіць адзенне», «даведацца што-небудзь новае» і нават «каб усе зайздросцілі», як упэўнена выкрыкнула маленькая дзяўчынка з галёркі.

Аксана Кірылаўна глядзела на нас вачыма ўдава, які пазірае ў клетку з трусамі. Яе дзяжурны сказ быў тыповым, кшталту «чалавек заўсёды павінен выглядаць цудоўна». Далей яна адкрыла нам розніцу паміж беларускімі і расійскім мадэлямі. Жыхаркі Белакаменнай больш нахабныя і ў іх мадэль — гэта праца. Нашы мінскія клушы, па меркаванні Кірылаўны, больш сціплыя і ў гэтым іх праблема. Але ёсць у мінскіх прыгажунях іншы козыр — акрамя мадэльнай справы яны маюць і асноўны заробак, працуюць па спецыяльнасці, а мадэль — гэта як хобі.

— Усе стылісты найперш працуюць з фотаздымкамі сваіх кліентаў, — працягвала тым часам Кірылаўна. — Хочаце ўбачыць сябе пад старасць? Вазьміце два фота: бацькі і маці. Я называю такі спосаб — «апрані Барбі». Вы бераце здымкі вашых бацькоў, а затым і сваё. Параўноўваеце і робіце высновы, якімі вы станеце пад старасць. Наша памылка ў тым, што мы не бачым сябе збоку. Вы прыйшлі сюды, каб стаць дасканалымі. Вось і гаварыце сабе пра гэта — ад кончыкаў валасоў да кончыкаў пальцаў, думайце пра кожны сантыметр свайго цела і адзення...

Сядзеў я ў гэтым кветніку і разважаў, што я тут раблю?! Няўжо ўсе тры месяцы давядзецца слухаць касметычныя парады??? Тут можна і з глузду з'ехаць.

Кірылаўна тым часам намалявала на дошцы партрэт чалавека ў разрэзе і прынялася тлумачыць, якія ў каго бываюць формы твару і што трэба рабіць, каб атрымаць ідэальны авал, які лічыцца эталонам прыгажосці.

За гэтую гадзіну, якую пані Аксана распавядала пра ўсё на свеце, я даведаўся, што перш чым выбіраць сабе касметыку, трэба ведаць колер сваіх зубоў і нават колер бялку вока (яно, як высветлілася, бывае блакітнаватым, чырванаватым і жаўтаватым). Даводзіла і пра стыль: маўляў, на яго фарміраванне ўплывае не толькі правільна падабранае адзенне, але і абрысы твару, форма носа, вуснаў і броваў. А форма носа абутку павінна адпавядаць форме нашага ўласнага носа (!).

— Хто дыктуе моду? Не, не мадэлі і нават не кіназоркі. Моду дыктуюць палітыкі! І зараз я патлумачу, чаму.

Ад моднага прыгавора Хакамадзе і Лужкову я ледзьве не заснуў. Лекцыя скончылася толькі ў раёне 22.00. Дадому я дабіраўся яшчэ гадзіну...

На наступны дзень я пазваніў у школу і пацікавіўся, ці будуць змены ў фарміраванні нашых груп (перспектыва рабіць зорачкі і бярозкі побач з вучаніцамі пачатковай школы не вельмі радавала). Адказалі, што групы ўжо сфарміраваныя, таму ніякіх зменаў не прадбачыцца. Тады я вырашыў, што на заняткі буду хадзіць па іншых днях.

**Ад аўтара:** *Адзінае, з чым я ніяк не мог пагадзіцца ў гэты вечар, гэта з тым, што мне патрэбна будзе навучыцца фарбавацца. У такія моманты я шчыра радаваўся ўнутры, што я не дзяўчына — інакш давялося б рабіць гэта з сабою кожны дзень. Пакуль жа думка пра касметыку ніяк не хацела мірыцца з маімі ўнутранымі ўстаноўкамі. Першы дзень майго эксперыменту заканчваўся ўдала, але я ведаў — настане час і давядзецца расказаць прычыну прыходу сюды. Патрэбна была легенда. Я спыніўся на самым простым: у агенцтва я прыйшоў, каб паставіць асанку. Улічваючы мой рост, цалкам магло сысці за праўду. І я не прагадаў: у хуткім часе мне па некалькі разоў давядзецца расказваць гэту гісторыю. Далейшыя заняткі будуць сціраць межы паміж намі — кандыдатамі ў мадэлі, і мы пачнём знаёміцца. Таксама я даведаюся, што такое пілінг і чаму мадэлі павінны піць ваду без газаў.*

Школа юнкараў

# «ХАРЧОВЫ ААЗІС» У СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ...

## ...або Не ведамі адзінымі

У тым, што дзеці могуць харчавацца ў школе не толькі якасна, але і смачна, нашых бацькоў пераконваюць ледзь не на кожным бацькоўскім сходзе. А вось погляд непасрэдна «спажыўца паслуг» школьнай сталоўкі.

Мяркую, не памылюся, калі скажу, што абед — любімы «ўрок» шмат каго з вучняў сярэдняй школы, а сталоўка — любімы «кабінет». І я не выключэнне. Перапынак на абед — гэта не проста час для паглынання ежы, не! Часам падаецца, што сталоўка — свяшчэнны аазіс пасярод бясконцай пустыні, або міраж, і варта прыгледзецца, як усё знікне ўмомант. Аднак, якім бы казачным ні ўяўлялася ўсё навокал, гэта ўсяго толькі сталоўка сярэдняй школы № 140. А я, мабыць, крыху перавучыўся...

Лепшы спосаб аднавіць патрачаную (шмат хто лічыць, што дарэмна) энергію — перахапіць у буфеце чаго-небудзь смачненькага. Спачатку, праўда, трэба будзе прайсці выпрабаванне, якое вызначыць, ці варты прэтэндэнт пакаштаваць пладоў працы школьных кухараў. О, гэта не так проста! Каб прарвацца да запаветнага прылаўка, давядзецца набрацца нахабства. Бо па-іншаму не атрымаецца. Прычына — адсутнасць чаргі, але не ахвотных падсілкавацца. У натоўпе нікога не хвалюе, хто і колькі тут ужо стаіць. Галоўнае — заняць выгадную пазіцыю і паспець першым працягнуць грошы буфетчыцы, якая адзіная захоўвае спакой у навакольным хаосе. Калі ўдалося звярнуць на сябе ўвагу гэтай прывабнай жанчыны, лічы, перамог.

І адплаціцца пераможцу спаўна! Самыя свежыя (калі пашанцуе) і самыя смачныя (вось гэтага, дакладна, не адняць) булачкі, якія, здаецца, самі гатовыя скокнуць у рот. Салаты ўсіх відаў, сокі, вафлі і... нават жэле па асобых днях, якія чамусьці не пазначаны на календарах як усенародныя святы. Так, выбар у нас шырокі. Але наша падарожжа па чароўным аазісе яшчэ толькі-толькі пачалося. Так што не спяшайцеся перагружаць страўнік!

Як толькі гучыць званок з урока, дзверы сталоўкі проста саскокваюць з завесаў. Гэта чарговая згаладалая паралель акіянскай хваляй уліваецца ў памяшканне і запаўняе яго да краёў. Сцены пакуль трымаюцца, але я зусім не ўпэўнены, што гэта надоўга... Лямант стаіць страшэнны! Паўсюль мітусяцца дзеці, спрабуючы заняць сваё законнае месца за сталом. Кухары і дзяжурныя марна спрабуюць іх супакоіць, каб раскласці ежу па талерках... Хтосьці на штосьці скардзіцца...

Дарэчы, аб скаргах. У такім шуме вельмі складана вырашаць праблемы, якія ўзнікаюць даволі часта. Напрыклад, камусьці не хапіла порцыі. Разбірацца, хто вінаваты, ужо даўно ніхто нават не спрабуе. Галоўнае — не тармазіць і забяспечыць беднае дзіця ежай. Фу, крызіс мінуў... Але куды там:

— А чаму гарбата халодная?!

— Што за брыдота?! Я гэта есці не буду, памяняйце мне!

Вось якія пераборлівыя! Ікры вам падавай, ці што?! З горным ласосем і труфелямі. Афіцыянт, прынясіце!

Сапраўды пякельная работа ў адказнага за харчаванне (ганаровы тытул, між іншым). Нават не ўяўляю, калі яны самі паспяваюць паесці. Мала таго, што даводзіцца булачкі кожны раз раздаваць (на такую сістэму перайшлі, каб пазбегнуць выпадкаў скрадання «румянага золата», якія пачасціліся), дык абавязкова яшчэ хто-небудзь пачне абурацца з нагоды таго, што «дзіўная маса, якая распаўзаецца па маёй талерцы, зусім неядомая». Даводзіцца адказнаму за харчаванне ісці і мяняць порцыю на што-небудзь іншае. Больш смачнае, падобнае на хатняе.

Няма нічога лепшага за хатнюю ежу! Ужо не ведаю, як кухары гэтага дамагліся, але ежа сапраўды падаецца хатняй. Здараецца, я нават забываюся, што ўсё яшчэ знаходжуся ў школе. І не я адзін такі!

— Ты маеш рацыю, — згодна заківаў мой аднакласнік Ягор. — З-за таго, што матуля ўвесь час занятая, мне даводзіцца гатаваць самому. Пасля гэтага школьная ежа — проста далікатэс!

На другім баку шаляў — меркаванне нязгодных. Гэта тыя, каму цалкам ці часткова не падабаюцца школьныя абеды. Іх усё адно прымушаюць есці. Загад зверху: «Усе без выключэння дзеці павінны харчавацца ў школьнай сталоўцы!» Кропка! Адзіны спосаб адмовіцца — напісаць заяву. Я пацікавіўся ў адзінага чалавека ў класе, які не паленаваўся так зрабіць, у чым прычына яго ўчынку.

— Грошай шкада, — адказаў мне Аляксей. — 15 тысяч на тыдзень — гэта занадта! Ды і не хачу я есці. Калі што, падсілкуюся ў буфеце.

Тым не менш, большасць вучняў нашай школы ўсё ж такі з задавальненнем сілкуюцца тым, што прапануе ім наш «харчовы аазіс». А я не хутка яшчэ пазбаўлюся ад жадання як след страсянуць тых індывідуумаў, якія нясуць здаваць у пасудамыйку поўныя талеркі з ежай... Вы б яшчэ насы заткнулі! Але нічога не зробіш. На гэты выпадак ёсць цудоўная беларуская прыказка: «Дзеду — міла, а ўнуку — гніла».

**Раман ДАВЫДКА,**
**вучань сярэдняй школы № 140 г. Мінска.**

Абітурыент-2010

# УДЗЕЛ У «РЭПЕТЫЦЫІ» ЦТ ПАВЯЛІЧВАЕ ШАНЦЫ НА ПОСПЕХ

**У Беларусі стартаваў другі раўнд рэпетыцыйнага тэсціравання. Як нагадалі нам у Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў, другі раўнд будзе доўжыцца да канца лютага. А ў сакавіку-красавіку ў краіне пройдзе трэці раўнд «рэпетыцыі» цэнтралізаванага тэсціравання. Дарэчы, падчас першага раўнда было здадзена больш як 50 тысяч чалавека-тэстаў.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У сталіцы рэпетыцыйнае тэсціраванне па матэрыялах Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў праводзяць Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, БДУІР, Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт, БНТУ, Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт, Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, БДЭУ, педагагічны і тэхналагічны ўніверсітэты, політэхнічны, аўтамеханічны і гандлёвы каледжы. У абласных і раённых цэнтрах гэту функцыю ўзялі на сябе Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны універсітэт, Полацкі дзяржаўны універсітэт, Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Беларуска-Расійскі ўніверсітэт, Бабруйскі філіял БДЭУ, Барысаўскі дзяржаўны політэхнічны каледж і Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж.

Акрамя таго, у Мінскай вобласці дагаворы з Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў заключылі аддзелы адукацыі Любанскага, Маладзечанскага, Чэрвеньскага, Капыльскага, Мядзельскага, Дзяржынскага, Клецкага і Нясвіжскага райвыканкамаў. У вучняў школ з гэтых раёнаў будзе магчымасць прайсці папярэднюю дыягностыку сваіх ведаў, так бы мовіць, не пакідаючы родных мясцін. Праўда, дзе здаваць «экзамены» — у роднай школе з поўным камфортам ці ўсё ж такі лепш паспрабаваць акунуцца ў атмасферу ВНУ — вырашаць ім самім. У любым выпадку на ўмовы, максімальна набліжаныя да «баявых», можна пакінуць трэцюю, апошнюю, спробу здачы рэпетыцыйнага тэсціравання. І хоць толькі ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні ні ў якім разе не дазваляе спадзявацца на стапрацэнтны поспех на цэнтралізаваным тэсціраванні, аднак абсалютна відавочна, што і псіхалагічная загартоўка, і тэхнічная падрыхтоўка ў немалой ступені ўплываюць на колькасць балаў падчас адказных выпрабаванняў.

— Я хацеў бы падзяліцца з вамі цікавай інфармацыяй, якую атрымалі нашы калегі з рэгіянальнага цэнтра тэсціравання Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, — паведаміў журналісту «Звязды» **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — Пасля аналізу вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання 2009 года і ўсіх трох этапаў рэпетыцыйнага тэсціравання, у якіх бралі ўдзел абітурыенты з Гродзеншчыны, высветлілася, што абітурыенты, якія ўдзельнічалі ва ўсіх трох этапах рэпетыцыйнага тэсціравання, паказалі на цэнтралізаваным тэсціраванні ў два разы вышэйшы бал, чым сярэдні па прадмеце сярод усіх удзельнікаў ЦТ. Тыя, хто ўдзельнічаў у двух этапах, атрымалі ў паўтара раза вышэйшы за сярэдні бал. А ўдзельнікі аднаго этапа рэпетыцыйнага тэсціравання паказалі сярэдні вынік.

Я лічу, што да рэпетыцыйнага тэсціравання трэба ставіцца, у першую чаргу, як да выдатнага сродку самадыягностыкі і адпрацоўкі тэставых тэхналогій. Увогуле, рэпетыцыйнае тэсціраванне, як мы заўважылі, прыцягвае матываваных школьнікаў з даволі моцнай сістэмнай падрыхтоўкай. І яны паказваюць лепшыя вынікі не таму, што тры разы адрэпеталі ЦТ. Для гэтых дзяцей і іх бацькоў вынікі рэпетыцыйнага тэсціравання становяцца сур'ёзным сігналам аб рэальным узроўні іх ведаў і, адпаведна, штуршком для больш узмоцненай падрыхтоўкі. Кожная новая «рэпетыцыя» экзамену — гэта спосаб яшчэ раз сябе праверыць.

Апрача таго, тэхнічныя навыкі на цэнтралізаваным тэсціраванні не менш важныя за трывалыя веды. Як працаваць з бланкамі адказаў, як адмяняць няправільныя адказы, як уносіць у клетачкі сімвалы хімічных элементаў, лічбавыя адказы ў выглядзе дробаў, адзінкі вымярэння, градусы, працэнты, метры, тоны — мы бачым, што далёка не ўсе з гэтым спраўляюцца. Гэта прыкладна тое ж, што запоўніць з першага разу дэкларацыю ў падатковай інспекцыі. Нават з другой ці трэцяй спробы не ў кожнага гэта атрымаецца. Між іншым, бланк цэнтралізаванага тэсціравання правярае камп'ютар, а не чалавек, таму і колькасць правак, што ўносяцца ў бланк, абмежаваная.

Вялікую ролю адыгрывае на цэнтралізаваным тэсціраванні таксама ўменне распараджацца адведзеным часам і не губляць каштоўныя хвіліны. Заўважана, што многія не могуць прымяніць свае веды ў сітуацыі, якая нават нязначна адрозніваецца ад стандартнай. Крыху змяняецца фармулёўка задання — і абітурыенты ўжо не разумеюць, чаго ад іх чакаюць стваральнікі тэста. Не ўнікаючы ў сутнасць задачы, яны адразу прыступаюць да яе рашэння. І зусім нядзіўна, што вынікі першых раўндаў рэпетыцыйнага тэсціравання аказваюцца горшымі, чым пры паўторных спробах.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)**

# МІНЧАНЕ Ў 2009 ГОДЗЕ ЧАСЦЕЙ ЖАНІЛІСЯ І СТАНАВІЛІСЯ БАЦЬКАМІ

**Так, шлюбнымі адносінамі сябе звязалі 16 510 пар (у 2008 годзе — 16 137). Летась было зарэгістравана нараджэнне 23 054 малых, што на 941 больш у параўнанні з папярэднім годам.**

Не мяняюцца перавагі бацькоў у выбары імёнаў для нованароджаных. Напрыклад у Фрунзенскім раёне ў хлопчыкаў лідзіруюць Іван, Арцём, Мікіта, Даніла, Аляксандр, Аляксей, Уладзіслаў, Максім, Мацвей, Дзмітрый. Гарачую дзясятку жаночых імёнаў складаюць Дар'я, Ганна, Паліна, Настасся, Марыя, Лізавета, Вікторыя, Ксенія, Аляксандра, Сафія.

**Святлана ФРАЛЯНКОВА, «Мінск—Навіны».**

# БЛАСЛАВЕННЕ ДЗЕЦЯМ

**Аддзяленне для дзённага знаходжання маладых інвалідаў Кастрычніцкага раёна ў Магілёве наведаў настаяцель царквы абраза Казанскай Божай Маці айцец Анатоль.**

Госць асвяціў хатнюю царкву ў сацыяльным цэнтры, памаліўся за здароўе і дабрабыт усіх дзяцей, зрабіў маладым інвалідам салодкія падарункі.

Святар доўга размаўляў з іх бацькамі: благаславення папрасіла маці дзяўчыны, якая цяпер здае сесію ў навучальнай установе і не мае ніякіх прывілеяў у параўнанні са сваімі здаровымі сакурснікамі, а таксама шматдзетныя бацькі, бо старэйшае дзіця з чатырох пакутуе ад сур'ёзнай хваробы.

Не ўсе гэтыя сем'і маюць магчымасць наведаць царкву, таму візіт праваслаўнага святара ў час калядных святаў парадаваў маладых інвалідаў, іх бацькоў і апекуноў.

**Ілона ІВАНОВА.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# МАМЫ—СТУДЭНТКІ

Свая справа

# ВУЧОБА ДЛЯ МАЛАДЫХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

Святлана СУХАРКО

**УЛАДКАВАЦЦА на добрую працу — гэтае пытанне заўсёды надзённае. Усе мараць знайсці працу не толькі па душы, але і хочуць, каб яна яшчэ прыносіла і фінансавае задавальненне. У такім выпадку лепш распачаць сваю справу. Як гэта зрабіць, з чаго пачаць? Дапамогу маладым і ініцыятыўным вырашыла аказаць моладзевая сацыяльная служба. З мая мінулага года на базе арганізацыі створаны моладзевы бізнэс-інкубатар.**

Для маладых людзей, якія хочуць распачаць сваю справу, прапанаваны льготныя ўмовы: мінімізацыя затрат на вядзенне бізнэсу, адрамантаванае памяшканне з мэбляй і камп'ютарам, бухгалтарскія і іншыя офісныя паслугі.

— Мы ўзялі на сябе адказнасць дапамагаць маладым прадпрымальнікам развіваць свой бізнэс, — кажа **генеральны дырэктар моладзевай сацыяльнай службы Рыма ЕПУР**. — Нашай службе ў лютым споўніцца 18 гадоў. І ўвесь гэты час мы самі зараблялі грошы, таму ў нас ёсць вопыт вядзення гаспадарчай дзейнасці. З улікам гэтага вопыту мы і распрацоўваем нашы праекты. Бізнэс-інкубатар ужо працуе. З канца снежня мінулага года мы пачалі набор людзей. І юнакі, і дзяўчаты павінны ведаць, што ў Мінску ёсць такі цэнтр, які працуе толькі для іх і дзе ім могуць аказаць кансультацыйную дапамогу, як правільна арганізаваць бізнэс. Так бы мовіць, своеасаблівая прафарыентацыя, але практычнай накіраванасці.

Не проста расказаць, што можаш, але і прапанаваць тое, што падыходзіць для працы — гэта першае. І другое — дапамагчы маладым развіць свой прыватны бізнэс. Мы прапануем ім невялікае памяшканне ў арэнду, і сваю справу можна развіваць. Маладыя людзі прыходзяць, рэгіструюць сваю справу на аптымальных умовах. Гэта як дзіцячы садок у бізнэсе. Але гэта ўжо іх прыватнае прадпрыемства. У нас ёсць адно вялікае памяшканне, дзе знаходзяцца 12 «гарачых сталоў». Яны ўжо аформленыя. На гэтых плошчах будуць адкрыты 12 фірмаў. Гэта такі першы праект у Беларусі.

А ідэя і насамрэч выдатная. Алгарытм такі. Прадпрымальнікаў-пачаткоўцаў размесцяць у інкубатары на адзін год. За гэты час яны павінны будуць зарыентавацца і зразумець, ці патрэбны ім свой бізнэс. На невялікай плошчы ў 5 квадратных метраў малады чалавек зможа зарэгістраваць сваю фірму. Сфера дзейнасці прадпрыемства можа быць самай рознай. Напрыклад, рамонт тэлевізараў, наладка камп'ютара, фотапаслугі і іншае. Такім чынам, студэнт ідзе ва ўніверсітэт на заняткі, а пасля ў яго ёсць, напрыклад, 4 гадзіны вольнага часу. Дыспетчар, які працуе ў моладзевай сацыяльнай службе, прымае заказы і «скідвае» іх маладому прадпрымальніку па электроннай пошце (а цяпер ноўтбук ёсць у большасці маладых людзей). Студэнт атрымлівае заказ, выконвае работу і атрымлівае грошы. Вось так і будзе развівацца яго справа. Задача маладога прадпрымальніка — якасна выканаць сваю работу. Астатнюю частку (рэклама, прасоўванне прадукту, выраб буклетаў) інкубатар бярэ на сябе. Вось у чым унікальнасць «гарачых сталоў». Дарэчы, такой практыкі няма ва ўсім свеце.

Таксама ў бізнэс-інкубатары будзе абстaлявана каля 20 пакояў пад офісы для, так бы мовіць, спрактыкаваных прадпрымальнікаў. Такія прадпрыемствы размесцяцца ў бізнэс-інкубатары на 3-5 гадоў. На працягу года ў бізнэс-інкубатары павінна з'явіцца каля 30 новых фірмаў.

— Такім чынам, — кажа Рыма Епур, — бізнэс-інкубатар здае ў арэнду памяшканне і прадастаўляе юрыдычны адрас для рэгістрацыі прадпрыемства. Акрамя таго, там жа аказваецца неабходная дапамога: метадычная, юрыдычная, бухгалтарскія і сакратарскія паслугі. А гэта вельмі важна. Маладыя людзі прыходзяць да нас з жаданнем падзарабіць. І гэта добра, але гэта не галоўнае. Калі ты становішся кіраўніком, ты адказваеш за людзей, якія ў цябе працуюць, нясеш крымінальную адказнасць за свае ўчынкі. Бізнэс — гэта заўсёды рызыка. І ніхто не можа даць гарантыі, што ўсё атрымаецца. Калі ты прымаеш на працу па дагаворы да сябе работнікаў, ты ўжо маеш пэўныя абавязацельствы. А раптам так здарыцца, што бізнэс не пайшоў. Звольніць проста так чалавека нельга. Таму мы і прапануем сваю дапамогу. У нас ёсць у штаце свой бухгалтар, які і аказвае маладому прадпрымальніку ўсе неабходныя бухгалтарскія паслугі. Калі бізнэс не пайшоў, на гэта месца прыйдзе новы чалавек.

У маладых людзей насамрэч шмат ідэй. У прыватнасці, ёсць прапановы па развіцці будаўнічага бізнэсу, вырабе будаўнічых матэрыялаў. «Гарачыя сталы» арыентаваны ў асноўным на паслугі. Гэта фотапаслугі, відэаздымка вяселляў, рэкламны бізнэс. Ёсць выпадкі, калі прыходзяць маладыя людзі, якія хочуць адкрыць свой КВЗ. І галоўнае тут — з усёй палітры праектаў вылучыць тыя, якія сапраўды маюць права на жыццё. «Часам мы адмаўляем маладому чалавеку, — кажа Рыма Епур. — Таму што самае галоўнае — правільны бізнэс-план. А гэта значыць, рэнтабельнасць і прыбытак. Вельмі высокі парог рызыкі. І, думаю, мы не заўсёды робім дрэнна, калі адмаўляем таму ці іншаму маладому чалавеку. Можа, ён пакуль не гатовы ўзяць на сябе такую адказнасць. А часам мы проста «будзім» яго амбіцыі і ён ідзе далей».

Заўважу, што важная ўмова для маладога прадпрымальніка — узрост да 31 года ўключна і наяўнасць актуальнага праекта. Адбор у інкубатар ужо пачаўся. На поўную магутнасць ён запрацуе ў сярэдзіне лютага. А пакуль праходзіць рэгістрацыя прадпрыемстваў.

# Удзел у «рэпетыцыі» ЦТ павялічвае шанцы...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

І ўсё ж я папрасіў бы не шукаць абсалютную заканамернасць паміж вынікамі рэпетыцыйнага і цэнтралізаванага тэсціравання і меркаваць, што балы на ЦТ будуць не меншыя, чым на «рэпетыцыі», ці нават больш высокія. Экзамен — гэта заўсёды стрэс, і псіхалагічная атмасфера ў экзаменацыйнай аўдыторыі — іншая. Ды і адказнасць на рэпетыцыйным тэсціраванні — зусім не тая, што на сапраўдным экзамене. Галоўным кантралёрам для абітурыента выступае ён сам, і калі той прыносіць у аўдыторыю калькулятар ці падручнік, то пра якую аб'ектыўнасць можа весціся гаворка. На ЦТ за калькулятар абітурыента проста адхіляць ад удзелу ў ЦТ. Таму я заклікаю ставіцца да «генеральнай рэпетыцыі» максімальна сур'ёзна. Па ўсіх прадметах удзельнікам рэпетыцыйнага тэсціравання будуць прапанаваныя два варыянты тэстаў, такім чынам пры жаданні па кожнай дысцыпліне можна будзе «патрэніравацца» двойчы.

Мікалай Фяськоў таксама паведаміў, што ў тэсты 2010 года будуць унесеныя некаторыя карэктывы. Спецыфікацыя тэстаў распрацоўваецца на падставе Праграм уступных іспытаў ў ВНУ і ССНУ. Па агульнай колькасці заданняў і ўзроўні складанасці тэсты застануцца нязменныя. Застанецца нязменным і час, што адводзіцца на правядзенне тэста. Але можа мяняцца, напрыклад, колькасць заданняў на тую ці іншую тэму.

Дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў упэўнены, што дзеля поспеху на ЦТ трэба шмат працаваць, прычым не толькі ў выпускным класе. І зусім немагчыма падрыхтавацца да тэсціравання за кароткі тэрмін, нават з дапамогай рэпетытара.

— Пры падрыхтоўцы да тэсціравання я не раіў бы абітурыентам спадзявацца толькі на зборнікі тэстаў, — дадаў Мікалай Фяськоў. — Тэсты — гэта толькі форма кантролю, а зусім не навучання, а тэставыя зборнікі — толькі дапаможны сродак для дыягностыкі ведаў. Галоўнае — выконваць патрабаванні школьнай праграмы і бліжэй пазнаёміцца з зацверджанымі праграмамі ўступных іспытаў для абітурыентаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Іх можна знайсці на адукацыйным партале (www.adu.by). Падрыхтоўку трэба весці па школьных падручніках, звяртаючы ўвагу на ўсялякія заўвагі, дадатковы матэрыял, даведнікі і практыкаванні. У ходзе падрыхтоўкі найбольшую ўвагу трэба ўдзяліць тым пытанням, з якімі не справіліся пры тэсціраванні абітурыенты мінулых гадоў. У нас ёсць зборнікі з аналізам найбольш характэрных памылак, дапушчаных абітурыентамі папярэдніх гадоў. Але чамусьці гэтыя памылкі працягваюць множыцца. Ёсць зборнікі, куды ўвайшлі тэсты па рускай і беларускай мовах, прапанаваныя абітурыентам у 2004—2008 гадах. Гэтыя зборнікі ўключаюць таксама адказы да ўсіх заданняў і дазваляюць прасачыць асноўныя тэндэнцыі ў фарміраванні тэстаў за апошнія гады.

**Трэба дадаць, што плата за ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні засталася ранейшай — 16 100 рублёў па кожнай дысцыпліне. Грошы за ўдзел у рэпетыцыйным тэсціраванні можна ўнесці ў любым аддзяленні ААТ «Беларусбанк». Атрымальнік — УА «Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў», разліковы рахунак № 3632934510021, філіял № 529 «Белсувязь» ААТ «ААБ Беларусбанк» г. Мінска, код 720, УНП 190194148.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

### Сярэдні бал сертыфіката ЦТ, залічаных на 1-ы курс БДУ ў 2008 г., у 2009 г. і сярэдні бал на рэпетыцыйным тэсціраванні, праведзеным у БДУ ў 2009—2010 навуч. г.г.

| Прадмет | 2008 г. | | 2009 г. | | РТ |
|---|---|---|---|---|---|
| | Дзённая бюдж. форма | Дзённая платн. форма | Дзённая бюдж. форма | Дзённая платн. форма | 1-ы этап |
| Руская мова | 68 | 49 | 75 | 57 | 52 |
| Беларуская мова | 71 | 54 | 80 | 65 | 61,9 |
| Фізіка | 62 | 33 | 62 | 34 | 31 |
| Матэматыка | 72 | 47 | 72 | 50 | 45,3 |
| Хімія | 56 | 33 | 66 | 39 | 42,9 |
| Біялогія | 59 | 39 | 63,5 | 44 | 50,8 |
| Англійская мова | 71 | 49 | 73 | 55 | 54,7 |
| Нямецкая мова | 65 | 51 | 67 | 55 | 59,2 |
| Іспанская мова | 82 | 59 | 83 | 59 | - |
| Французская мова | 62 | 50 | 70 | 71 | 46,2 |
| Гісторыя Беларусі | 60 | 40 | 60 | 40 | 41,7 |
| Грамадазнаўства | 61 | 44 | 68,5 | 54 | 46,8 |
| Геаграфія | 64 | 39 | 67 | 40 | 41,5 |
| Сусветная гісторыя найноўшага часу | 59 | 36 | 75 | 45 | 58 |

**інфармацыя з сайта Белдзяржуніверсітэта www.bsu.by*

## Снежнае спаборніцтва

Людзі, што праходзілі днямі па скверы Янкі Купалы, напэўна былі крыху здзіўлены відовішчам дзяўчат і юнакоў, якія шпурлялі адно ў аднаго снежкамі. Нехта спыняўся, нехта недарэчліва пажымаў плячыма. Але самі ўдзельнікі незвычайнай моладзевай сустрэчы пад назвай «Снежны бой» адчувалі сябе... цудоўна. Менавіта так, цудоўна: снежнае паветра, жарты, забаўляльныя спартыўныя спаборніцтвы. І, вядома ж, снег, які не вельмі хацеў паддавацца лепцы ў 10-градуснае надвор'е. Аднак жа самі ўдзельнікі не турбаваліся і не злаваліся на гэтыя недарэчныя паводзіны галоўнага атрыбута зімовых спаборніцтваў. Усё адно снег лётаў ды лётаў, таму што... А як жа інакш? Снежны бой — гэта перш за ўсё снег (у любым выглядзе!).

Гэта было нешта падобнае да так званых моладзевых флэшмобаў, але не зусім тое ж самае. Гэта дзеянне было больш падобна да добрай дзіцячай гульні ў двары якога-небудзь шматпавярховага дома. Арганізатарамі сустрэчы выступілі студэнты розных навучальных устаноў Мінска. Дарэчы, яны былі ў адзенні белых зайцаў і выглядалі зусім як сапраўдныя чароўныя істоты, якія могуць беспярапынна забаўляцца колькі дзён запар. Некалькі дзясяткаў маладых людзей далучылася да гэтай бяспечнай і безахвярнай «сечы». Колькі чалавек падышло ўжо падчас дзеяння: усе прымаліся, бо ў такой гульні няма паняцця «лішні» або «непатрэбны».

Зразумела, што было дзве каманды, якія супрацьстаялі адна другой у розных спаборніцтвах. Спачатку перацягвалі канат, правяраючы моц абедзвюх «снежных груповак». Потым быў конкурс Дзедаў Марозаў, якія выбівалі снежкамі прадстаўнікоў іншай каманды. Акрамя гэтага былі незапланаваныя атакі, планы, як падарыць камандзе насупраць больш снежнага настрою. І гэтая адна з паловай гадзіна, што была запоўнена вясёлым смехам і «палётамі» снежак, праляцела як адзін момант. Нават замерзнуць не паспелі ўдзельнікі, толькі крыху «прамачылі» свае рукавіцы ды боты. Але разыходзячыся з «месца бою», на гэта ўжо ніхто не звяртаў увагі, бо ўражанні былі пазітыўнымі і па-сапраўднаму зімовымі. Усе радаваліся, як дзеці, і ззялі, як той іскрысты снег.

**Вольга НЯХЛЕБАВА.**

**Хакей**

## ШТО ТАКОЕ «НЕ ШАНЦУЕ» І ПРЫЧЫМ ТУТ ТРАКТАР

Яўген ВАРАКСА

**КАМАНДА з, напэўна, самай беларускай назвай стала апошнім супернікам хакейнага «Дынама» ў студзеньскай хатняй серыі на «Мінск-Арэне». «Трактар» з Чалябінска амаль увесь час абараняўся, але, тым не менш, атрымаў важную перамогу і ў добрым настроі адправіўся дахаты. Сапсаваўшы тым самым юбілей мінчанам. Для тых гэта была сотая гульня за два сезоны ў КХЛ.**

Цяжка разважаць над тым, што адбываецца насуперак усім законам логікі. Чакаеш, напрыклад, вядомай і добра вывучанай дарогі, усе дарожныя знакі аб гэтым сведчаць, а тут раптоўна за паваротам — абрыў. Безумоўна, спорт тым і цікавы мільёнам заўзятараў, што прадказаць загадзя пераможцу можна, але толькі ў частцы выпадкаў. Каму, як не беларусам, якія яшчэ праз шмат пакаленняў будуць перадаваць сапраўдную легенду аб кідку Копаця і скачкам на месцы Томі Сала ў 2002 годзе, аб гэтым ведаць... Але шчасце бывае і няшчасцем. Панядзелак. Вечар. Маштабы іншыя, сэнс — той самы. «Правісеўшы» амаль тры перыяды на варотах Фокіна, дынамаўцы, між тым, забілі толькі аднойчы. Чалябінцы атакавалі зрэдку ды і не вельмі небяспечна, але ўскалыхнулі сетку за шырокай спінай Віталя Коваля ўдвая больш.

Як не выкарыстоўвалі свае выдатныя шанцы Пелтанен, Плат, Варламаў, Качаткоў. Спіс можна працягваць і працягваць, называючы амаль увесь склад «бела-блакітных». Дык вось, проста цяжка ўявіць, як хакеісты нашай каманды не забівалі з розных сітуацый. Якім бы чорным гумарам ні гучала, але асабліва крыўдна за айчынных гульцоў. У беларусаў на генетычным узроўні ўжо павінна было даўно адкласціся, што і як рабіць з трактарам (у сэнсе — з «жалезным канём»), каб ён працаваў так, як трэба. А тут не атрымалася. Лёс нібыта здзекаваўся на працягу ўсяго паядынку з гаспадароў, пакідаючы толькі расчараванне пасля чарговага нявыкарыстанага моманту. «Ніякімі» былі і твары двух Андрэяў: Мезіна (на лаўцы запасных) ды Стася (які быў пакінуты па-за заяўкай і назіраў за дзеяннямі партнёраў з трыбуны). Пры тым усім, нельга сказаць, што вось той недапрацаваў, а той мог лепш. «Зубры» паказвалі яскравую і хуткую гульню, але хакейныя багі гэтым марозным вечарам не выбраліся на праспект Пераможцаў. Апошні, дарэчы, пакуль для «Дынама» не апраўдвае сваю назву — што ў Палацы спорту, што на «Мінск-Арэне» паражэнняў больш, чым перамог. Паводле «дамашняй» статыстыкі, каманда Аляксандра Андрыеўскага займае месца ў трэцяй дзясятцы.



Фота БЕЛТА.

Што далей? Наперадзе вельмі складаная серыя выязных гульняў супраць суседзяў па дывізіёне (рыжскія і маскоўскія дынамаўцы, піцерскія армейцы) і не толькі. Найбліжэйшыя супрацьстаянні канчаткова вызначаць, ці трэба нам спадзявацца на плэй-оф. Хоць ад «Дынама» ўжо не ўсё залежыць. Трэба яшчэ, каб супернікі (галоўным чынам — «Тарпеда», «Паўночсталь» і «Дынама-Рыга») гублялі балы.

## ДЗЕЦІ НАМАЛЯВАЛІ «КАЛЯДНЫЯ МАТЫВЫ»

Больш за 150 дзяцей ва ўзросце да 15 гадоў сталі аўтарамі каля 350 работ, якія прадстаўлены на абласной выставе дзіцячай творчасці «Калядныя матывы» ў Віцебскім абласным інстытуце развіцця адукацыі.

Сярод аўтараў ёсць і дашкольнікі, і выхаванцы нядзельных праваслаўных школ, і вучні гімназій... Работы выкананы ў розных тэхніках. Іх аб'ядноўвае не толькі тэма, але і тое, што творы вельмі шчырыя. Як падкрэсліваюць арганізатары праекта, адна з мэтаў правядзення выставы — далучэнне дзятвы да багатай культуры і традыцый беларускага народа.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# КАЛІ ЗА ДРОТАМ ЛЕПШ, ЧЫМ ДОМА

### Карэспандэнт «ЧЗ» пабываў у адной з дзвюх беларускіх выхаваўчых калоній, дзе адбываюць пакаранне больш за 280 няпоўнагадовых хлопцаў

— Наша задача зрабіць так, каб тыя падлеткі, якія ў нас адбываюць пакаранне, маглі стаць пасля вызвалення дастойнымі грамадзянамі. Умелі, не парушаючы закону, зарабіць, атрымаць, калі захочуць, і вышэйшую адукацыю, — расказвае **начальнік віцебскай выхаваўчай калоніі № 1, падпалкоўнік унутранай службы Аляксандр ГАРАЛЁЎ**. — Працоўная практыка паказвае, што большасць да нас не вяртаюцца.

Па маёй просьбе ён расказаў пра лёс некалькіх юнакоў. Так, яны парушылі закон, за што іх і асудзілі, але, упэўнены, калі б бацькі, сваякі надзялялі больш увагі іх выхаванню, не трапілі б яны за дрот. Вось гісторыя аднаго юнака, якога асудзілі за крадзеж. Раней яго сям'я жыла ў Мінску ў прэстыжным раёне. Маці і дзед вялікія аматары выпіць. Як кажуць, «прапілі» кватэру. Цяпер жывуць за межамі сталіцы.

— Мне ён амаль што з плачам скардзіцца: дадому дазволілі патэлефанаваць (дазваляецца паслухмяным выхаванцам гэта рабіць па «графіку». — **А.П.**), дзякуй вам за гэта, тэлефаную, а дзед нецвярозы. Маці ён не клікала, якая таксама «пад чаркай», — працягвае падпалкоўнік. — Ну, дык і куды ён вернецца? Дарэчы, перад вызваленнем з выхаванцамі вельмі актыўна працуюць псіхолагі — як паводзіць сябе на волі, каб, не дай Божа, не сарвацца, не трапіць зноў за дрот. Каб маглі самастойна зарабіць на жыццё, даём магчымасць атрымаць у калоніі прафесію.

Між іншым, акрамя вельмі запатрабаваных розных будаўнічых прафесій, рэзчыка па дрэве ў калоніі даюць магчымасць стаць... швачкай.

— А чаго вы здзіўляецеся? — каментуе гэта начальнік. — Вядома нямала мадэльераў мужчын. Вельмі запатрабаваная прафесія на рынку працы.

Мяне па-добраму здзівіла гісторыя пра аднаго выхаванца, які пасля таго як сам пашыў бялізну, папрасіў дазвол адправіць камплект на волю маці. І такое ў калоніі не забараняецца.

Падчас наведвання калоніі мне дазволілі пабываць у тутэйшай школе. Тут атрымліваюць адукацыю больш за 200 чалавек. Праўда, тут не задаюць хатніх заданняў, зразумела, не выклікаюць бацькоў тых, хто дрэнна вучыцца. Я пасядзеў на занятку, прысвечаным мінуламу Году роднай зямлі. **Выкладчык геаграфіі, біялогіі, экалогіі і краязнаўства Вольга Шыянава і выхавальнік Аляксандр ДОРАГАЎ** разам з хлопцамі — вучнямі 10 класа ўчынілі завочнае і вельмі захапляльнае падарожжа па роднай краіне. Гаварылі пра помнікі прыроды, якія трэба ахоўваць...

І гэты Год якасці калонію таксама, як кажуць, «не абыдзе»: плануюць павысіць якасць прадукцыі, а тут, у ліку іншага, вырабляюць нават мэблю. Правядуць тэматычныя заняткі ў школе і ПТВ.

Напрыканцы наведвання калоніі мне расказалі, што будзе хутка тут і сваё тэлебачанне! Дзіўна. Хоць дзейнічае ж пры калоніі самадзейны тэатр. І за межамі калоніі выступаюць выхаванцы.

Шчыра хочацца, каб тыя, хто тут адбывае пакаранне, насамрэч надалей сталі добрымі людзьмі. Афіцэры і настаўнікі робяць для гэтага ўсё магчымае.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ОАО «ЛИФТСЕРВИС»

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2010 года

| Актив | Код строки | На начало года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства (без учета стоимости переоценки) | | | |
| первоначальная стоимость | 101 | 3 685 | 3 746 |
| амортизация | 102 | 1 111 | 1 229 |
| остаточная стоимость | 110 | 2 574 | 2 517 |
| Нематериальные активы | | | |
| первоначальная стоимость | 111 | 1 | 1 |
| амортизация | 112 | 1 | 1 |
| остаточная стоимость | 120 | – | – |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | **2 574** | **2 517** |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 776 | 666 |
| В том числе: сырье, материалы и другие аналогичные активы | 211 | 763 | 643 |
| расходы будущих периодов | 218 | 13 | 23 |
| Дебиторская задолженность | 240 | 2 549 | 2 972 |
| В том числе: покупателей и заказчиков | 241 | 2 482 | 2 768 |
| поставщиков и подрядчиков | 242 | 45 | 106 |
| по налогам и сборам | 243 | – | 4 |
| разных дебиторов | 245 | 21 | 11 |
| прочая дебиторская задолженность | 249 | 1 | 83 |
| Денежные средства | 260 | 581 | 866 |
| **ИТОГО по разделу II** | 290 | **3 906** | **4 504** |
| **БАЛАНС (190+290)** | 700 | **6 480** | **7 021** |
| **Пассив** | | | |
| Уставной фонд | 410 | 40 | 40 |
| Добавочный фонд | 430 | 2 564 | 2 558 |
| Нераспределенная (неиспользованная) прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 3 266 | 3 892 |
| Доходы будущих периодов | 470 | 38 | – |
| **ИТОГО по разделу III** | 490 | **5 908** | **6 490** |
| **V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Кредиторская задолженность | 620 | 572 | 531 |
| В том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 621 | 3 | 2 |
| перед покупателями и заказчиками | 622 | 20 | 15 |
| по расчетам с персоналом по оплате труда | 623 | 258 | 307 |
| расчеты по налогам и сборам | 625 | 159 | 154 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 626 | 100 | – |
| перед прочими кредиторами | 628 | 32 | 53 |
| **ИТОГО по разделу V** | 690 | **572** | **531** |
| **БАЛАНС (450+590+690)** | 700 | **6 480** | **7 021** |
| Из строки 620: краткосрочная кредиторская задолженность | 702 | 572 | 531 |
| **АКТИВЫ, ОБЯЗАТЕЛЬСТВА, УЧИТЫВАЕМЫЕ ЗА БАЛАНСОМ** | | | |
| Амортизационный фонд воспроизводства нематериальных активов | 013 | 42 | 55 |

### ИНФОРМАЦИЯ ОБ ОАО «ЛИФТСЕРВИС» И ЕГО ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

1. Количество акционеров: всего — 803, в том числе юридических лиц — 1, физических лиц — 802.

2. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателя | Ед. изм. | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | млн руб. | 162 | 162 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | руб. | 800 | 800 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества (без учета стоимости переоценки основных средств) | тыс. руб. | 32,08 | 29,01 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | 202328 | 202328 |

3. Информация о задолженности:

| Наименование показателя | Ед. изм. | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | млн руб. | 419 | 174 |
| Просроченная кредиторская задолженность | млн руб. | – | – |

4. Отдельные финансовые результаты:

| Наименование показателя | Ед. изм. | 2009 г. | 2008 г. |
|---|---|---|---|
| Выручка от реализации работ, услуг (за минусом налогов) | млн руб. | 22205 | 19475 |
| Себестоимость реализованных работ, услуг | млн руб. | 18714 | 16589 |

5. Среднесписочная численность работающих (человек) — 874.

6. Основной вид деятельности: монтаж, наладка, ремонт и техническое обслуживание подъемного и такелажного оборудования.

УНП 100088852

### РЕЗУЛЬТАТЫ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОАО «ЛИФТСЕРВИС» за 2009 год

| № п/п | Наименование показателей | Ед. изм. | 2009 год |
|---|---|---|---|
| 1 | Выручка от реализации работ (услуг) | млн руб. | 22 618 |
| 2 | Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | -II- | 18 714 |
| 3 | Прибыль от реализации товаров, продукции, работ, услуг | -II- | 2 886 |
| 4 | Начисленные налоги и сборы из прибыли | -II- | 959 |
| 5 | Дебиторская задолженность | -II- | 2 972 |
| 6 | Кредиторская задолженность | -II- | 531 |
| 7 | Чистая прибыль, всего в том числе: расходы на оплату труда из чистой прибыли | -II- | 1 088 |
| 8 | Направлено чистой прибыли на увеличение Уставного фонда | -II- | 0 |
| 9 | Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | -II- | 162 |
| 10 | Дивиденды на одну акцию, выплаченные в данном отчетном периоде, всего | руб. | 800 |
| 11 | Количество акционеров, всего в том числе: юридических лиц физических лиц | чел. % акций чел. | 803 19,08 802 |
| 12 | Среднесписочная численность работающих | чел. | 874 |

УНП 100088852


Минский городской центр недвижимости

### УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 03 февраля 2010 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белпромтара» (продавец)

**На аукционные торги выставляются:**

| Номер лота | № 2 | № 3 | № 4 |
|---|---|---|---|
| **Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота** | - здание специализированное иного назначения (здание административно-хозяйственное с пристройкой – 8 кв. м, дворовым покрытием – 3200 кв.м, забором, воротами, калиткой), инв. номер 640/С-26358, площадь – 91,0 кв. м; - здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад с котельной с пристройкой), инв. номер 640/С-26363, площадь – 831,0 кв. м; -здание специализированное иного назначения (цех ремонта возвратной тары со складом и навесом), инв. номер 640/С-26356, площадь – 233 кв. м; -здание специализированное иного назначения (цех новой тары с механической мастерской и пристройкой), инв. номер 640/С-26361, площадь – 708,0 кв. м; - сооружение специализированное энергетики (кабельная линия электропередач), инв. номер 640/С-50116; -сооружение специализированное коммунального хозяйства (водопровод), инв. номер 640/С-50117; - зеленые насаждения производственной территории, инв. номер 070/09. | - здание специализированное иного назначения (здание арочного типа), инв. номер 610/С-29306, площадь – 433,0 кв.м; - здание специализированное иного назначения (производственный корпус с навесом и холодной пристройкой), инв. номер 610/С-29302, площадь – 247,9 кв. м; - здание специализированное иного назначения (здание арочного типа), инв. номер 610/С-29297, площадь – 426,0 кв.м; - здание специализированное иного назначения (помещение охраны с пристройкой, крыльцом, дорогой, площадкой, забором), инв. номер 610/С-29321, площадь – 66,0 кв.м; - здание административно-хозяйственное (административно-бытовой корпус с холодной пристройкой), инв. номер 610/С-29308, площадь – 231,0 кв. м; - сооружение специализированное энергетики (линия электроснабжения), инв. номер 610/С-48383; - зеленые насаждения производственной территории, инв. номер 071/09. | - здание конторы (с холодной пристройкой), инв. номер 622/С-20476, площадь – 52,1 кв. м; - здание слесарной мастерской, инв. номер 622/С-20473, площадь – 38,4 кв. м; - здание цеха ширпотреба, инв. номер 622/С-20474, площадь – 345,6 кв. м; - здание цеха ширпотреба, инв. номер 622/С-20475, площадь – 71,7 кв. м; - здание специализированное энергетики, инв. номер 622/С-33647, площадь – 37,4 кв. м; - насаждения производственных площадей, инв. номер 077/09. |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, Слуцкий район, г. Слуцк, пер. Пролетарский, 2-й, д. 12 | Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Заводская, 31 | Минская область, Столбцовский район, Новосверженский с/с, д. Новый Свержень, ул. Железнодорожная, 12 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 1,0180 га, кадастровый номер 624650100001005929, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений | площадь – 1,8144 га, кадастровый номер 640400000012000062, назначение – обслуживание и эксплуатация зданий и сооружений производственной базы | площадь – 1,9276 га, кадастровый номер 625484503101000700, назначение – эксплуатация и обслуживание зданий и сооружений |
| **Начальная цена с учетом НДС** | 529 541 880 белорусских рублей | 385 560 000 белорусских рублей | 139 356 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 52 000 000 белорусских рублей | 38 000 000 белорусских рублей | 13 000 000 белорусских рублей |
| **Обременение договорами аренды: номер, дата (срок действия)** | | № 21 от 07.08.2009 (по 06.08.2012) здание арочного типа – 213,0 кв. м; 10,4 % | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится **03 февраля 2010 года** в 12.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с **20.01.2010 по 01.02.2010** включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(017) 294 67 13, (8029) 636 15 22 – ОАО «Белпромтара».**
**Интернет: www.mgcn.by**



Минский городской центр недвижимости

### УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ» (организатор аукциона) 03 февраля 2010 года повторно проводит открытый аукцион по продаже зданий, сооружений и иного имущества, находящегося в собственности ОАО «Белпромтара» (продавец)

**На аукционные торги выставляются:**

| Номер лота | № 1 | № 2 | № 3 | № 4 |
|---|---|---|---|---|
| **Наименование и характеристики имущества, входящего в состав лота** | - здание конторы, инв. номер 630/С-42877, площадь – 278,8 кв.м; - здание котельной с сушилкой, инв. номер 630/С-42872, площадь – 170,0 кв.м; - здание цеха новой тары, инв. номер 630/С-42874, площадь – 476,4 кв.м; - здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42875, площадь – 993,0 кв.м; - здание гаража, инв. номер 630/С-42876, площадь – 318,9 кв.м; - здание склада хранения тары, инв. номер 630/С-42879, площадь – 655,9 кв.м; - здание лесопильного цеха, инв. номер 630/С-42855, площадь – 481,7 кв.м; - здание производственного цеха тары, инв. номер 630/С-42869, площадь – 597,7 кв.м; - асфальтовое покрытие, инв. номер 630/С-50723, площадь – 6199,8 кв.м; - водоем пожарный, инв. номер 630/С-50720; объем – 158.4 куб. м, диаметр – 7,0 м, глубина – 3,6 м; - участок водопроводной сети, инв. номер 630/С-50721, протяженность – 159,5 м;- линия электропередач, инв. номер 630/С-50726, протяженность – 656 м; - насаждения производственных площадей инв. номер 051/09 | - контора с пристройкой, инв. номер 631/С-8478, площадь – 104,6 кв.м; - навес хранения тары, инв. номер 631/С-8416, площадь 517,3 кв.м; - цех ремонта картонной тары, инв. номер 631/С-8418, площадь – 321,0 кв.м; - здание гаража с пристройкой, инв. номер 631/С-8419, площадь 149,4 кв.м; - цех тарный, инв. номер 631/С-8422, площадь 57,3 кв.м; - склад хранения тары, инв. номер 631/С-8424, площадь – 610,0 кв.м; - цех новой тары, инв. номер 631/С-8454, площадь 252,5 кв. м; - ленкомната, инв. номер 631/С-8459, площадь 61,8 кв. м; - линия электропередач, инв. номер 631/С-12634, протяженность – 179,5 м; - водоем пожарный, инв. номер 631/С-12636, объем – 8.0 куб. м, диаметр – 2,0 м, глубина – 2,5 м; - насаждения производственных площадей, инв. номер 053/09. | - Административное здание (в том числе: уборная, ограждение, ворота металлические, ворота металлические, забор деревянный, колодец ж/б), инв. номер 443/С-1626, площадь 82,0 кв. м; - склад тары № 1, инв. номер 443/С-1627, площадь – 99,6 кв. м; - склад тары № 2, инв. номер 443/С-1628, площадь 98,6 кв.м; - склад прочей тары, инв. номер 443/С-1629, площадь – 973,4 кв.м; - навес для хранения тары, инв. номер 443/С-1630, площадь – 412,6 кв.м; - насаждения производственных площадей, инв. номер 052/09. | - Здание конторы (в том числе: беседка, беседка, уборная, забор, ворота, калитка), инв. номер 450/С-5923, площадь 54,1 кв. м; - производственный цех, инв. номер 450/С-5926, площадь – 1220,9 кв.м; - асфальтобетонное покрытие, инв. номер 450/С-20691, площадь – 1091,1 кв.м; - канализационный выпуск, инв. номер 450/С-20693; - водопроводный ввод, инв. номер 450/С-20694; - сеть электроснабжения, инв. номер 450/С-20695, - зеленые насаждения. |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Либаво-Роменская, д. 54 | Минская область, г. Вилейка, ул. Шубина, д. 41 | Гродненская область, г. Сморгонь, ул. Железнодорожная, д. 7 | Гродненская область, г. Слоним, ул. Железнодорожная, д. 3 |
| **Сведения о земельном участке** | площадь – 2,6213 га, кадастровый номер 642000000003001231; площадь – 0,1816 га, кадастровый номер 642000000003001230, назначение – содержание и обслуживание зданий и сооружений | площадь – 1,0695 га, кадастровый номер 621350100007001681, назначение – обслуживание зданий и сооружений | площадь – 0,9336 га, кадастровый номер 425650100001000935, назначение – размещение производственной базы | площадь – 0,5614 га, кадастровый номер 425450100001001503, назначение – обслуживание зданий и сооружений |
| **Начальная цена с учетом НДС** | 875 038 800 белорусских рублей | 336 912 000 белорусских рублей | 217 383 600 белорусских рублей | 220 362 120 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 85 000 000 белорусских рублей | 30 000 000 белорусских рублей | 20 000 000 белорусских рублей | 20 000 000 белорусских рублей |
| **Обременение договорами аренды: номер, дата (срок действия)** | | № 2/08 от 15.02.2008 (по 14.02.2013) S ар. = 38,6 кв.м; 1,8 % | | |

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, условиями проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенные банком копии платежных поручений, подтверждающих внесение задатка; а также иные документы в соответствии с условиями проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012024570010 в филиале ОАО «БПС-Банк» по Минской области, г. Минск, код 153001331, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемый объект (лот). Порядок проведения торгов указан в условиях проведения аукциона.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем аукциона заключается в течение 20 календарных дней с даты проведения аукциона. Оплата объекта (лота) осуществляется в течение 30 календарных дней с даты проведения аукциона. Аукцион состоится 03 февраля 2010 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются с 20.01.2010 по 01.02.2010 включительно в рабочие дни с 09.00 до 18.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 227 48 36 – УП «Минский городской центр недвижимости»;**
**(017) 294 67 13, (029) 636 15 22 – ОАО «Белпромтара».**
**Интернет: www.mgcn.by**


Утерянный **полис серии BY № 3619671** страховой компании ЗАСО "Промтрансинвест" по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств, выезжающих в страны системы "Зелёная карта" **считать недействительным**.

